ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАНЬНЯ XV
№ 147 (4399)
Нядзеля, 3 ліпеня
1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — На рубяжы дзьвюх пяцігодак. К. ВЕРАМЕЙЧЫК — За перабудову партработы ў жывёлагадоўчых калгасах (2-ая стар.). СТЫБА — Латвійская буржуазія шукае выхаду з эканамічнага крызісу (3 стар.). ЗЬМ. ПАВАРОТНЫ — У БССР створан опэрны тэатр (4-ая стар.).

Поліва — адказьнейшы этап у барацьбе за ўраджай (1 стар.).

Гомель перавыканаў заданьне па рэалізацыі пазыкі сярод працоўных гораду, па яго прыкладзе ўдарнымі тэмпамі завяршыць падпісную кампанію (1-ая стар.).

У торфаздабычы пералому яшчэ няма (2 стар.).

Спажывецкая кааперацыя дрэнна змагаецца за разгортваньне калгаснага гандлю (2 стар.).

Ліквідаваць адставаньне папяровай прамысловасьці БССР (2 стар.).

VI ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ. Разгортваньне выхаваўчай работы—важнейшая задача камсамолу (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Крызіс наносіць новыя магутныя ўдары па капіталістычнай сыстэме (4-ая стар.).

Пляны брытанскага імпэрыялізму ў Тыбэце (4 стар.).

На рубяжы дзьвюх пяцігодак

VII усесаюзная канфэрэнцыя камсамолу зьбіраецца па рубяжы дзьвюх пяцігодак, калі зусім відавочна завяршэньне першай пяцігодкі за чатыры гады.

Імя ленінскага камсамолу непарыўна зьвязана з разгортваньнем сацыялістычнага спаборніцтва мас, з барацьбой працоўных за датэрміновае выкананьне першай пяцігодкі, за індустрыялізацыю краіны, за калектывізацыю сельскай гаспадаркі, за генэральную лінію партыі, **супроць апартуністаў справа і «зьлева».**

Посьпехі і дасягненьні першай пяцігодкі надзвычай адчувальна і пераканаўча адбіліся на жыцьці працоўнай моладзі. Вось што дала моладзі чашай краіны пяцігодка.

Да пачатку пяцігодкі мы мелі 2.200 тыс. маладых пралетараў, зараз з 19.700 тыс. (лік працаўнікоў народнай гаспадаркі без батрацтва і МТС) маем маладых пралетараў да 23 год 6.360 тыс., або 32,3 проц. Рост амаль **у тры разы.** Сярод прамысловых рабочых колькасьць моладзі складае 40,3 проц., сярод новых-жа папаўненьняў прамысловага пралетарыяту за 1930-31 г. г.—65 проц.

У пачатку пяцігодкі ў фабзавучы было 190 тыс., зараз 1.100 тыс., а да канца году будзе паўтара мільёна. Амаль усе падросткі нашых гарадоў ахоплены ФЗВ, паміма значнай колькасьці падросткаў вясковых. Да пачатку першай пяцігодкі колькасьць вучняў ВНУ і ВТНУ складала 167 т. чал. Да канца 1931 году яна ўжо дасягнула 404 тыс. чал., а да канца першай пяцігодкі дойдзе да 542 тыс., г. зн. павялічыцца ў 3½ разы. У вышэйшай і сярэдняй прафэсыянальнай школе ў нас ужо навучаюцца звыш 1.200 тыс. чал., тады як колькасьць вучняў у ПАЗШ (коледжы, унівэрсытэты і інш.) складае **827,7 тыс. чал.**

Усё гэта адбываецца ва ўмовах поўнай ліквідацыі беспрацоўя, калі перад працоўнай моладзьдзю СССР усе дзьверы да працоўнага жыцьця, да любой прафэсіі, любой работы адкрыты ў той час, як у капіталістычных краінах моладзь асуджана на беспрацоўе. **«Взльт ам абэнд»** 11 лютага 1932 году піша аб тым, што з 1 мільёна падросткаў ва ўзросьце ад 14 да 16 год, канчаючых школы Германіі вясной гэтага году, **90 проц. з самага пачатку асуджаны на тое, каб шукаць сабе выпадковай работы для існаваньня.**

Малады савецкі рабочы, калгасьнік, служачы ведае, што будзе з ім і з яго краінай праз год, праз 5 год. Ён ведае, што работа для яго **забясьпечана,** што зараз ён жыве лепш, чым 5 год назад (а тым больш да рэвалюцыі!), і што яшчэ праз 5 год ён будзе жыць у некалькі раз лепш. Ён ведае, што будуць пабудаваны Камышынская плацціна і 3 гідрастанцыі на Сярэдняй Волзе, што будуць пушчаны ў ход сотні новых заводаў, **што выраб прадметаў спажываньня будзе павялічан да канца другой пяцігодкі ня менш чым у тры разы, што прадукцыйнасьць сельскай гаспадаркі будзе няўхільна павышацца,** што ў краіне будуць ліквідаваны клясы і будзе створана сацыялістычнае бясклясавае грамадзтва. Савецкі рабочы, малады і стары, наш калгасьнік, усе працоўныя **ўпэўнены** ў сваім заўтрашнім дні.

Калі з кожным годам усё больш павышаецца ўдзельная вага і значэньне моладзі сярод работнікаў сацыялістычнай індустрыі і транспарту, **дык яшчэ больш важную ролю можа і павінна адыграць моладзь у справе далейшага шпаркага ўздыму сацыялістычнага зямляробства.** У нас зараз ёсьць усе магчымасьці рушыць далей наперад сацыялістычнае зямляробства нябывалымі дагэтуль тэмпамі. Створан фундамант сацыялістычнай эканомікі. Створаны матар'яльныя прадпасылкі для шпаркага тэхнічнага пераўзбраеньня сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі (трактарныя і камбайныя заводы, рост выпуску с.-г. машын, пуск хэмкамбінатаў і г. д.). Аб гэтым гавораць таксама вынікі весьпавой сяўбы, якія паказваюць, што рашучая перамога сацыялістычных элемэнтаў у сельскай гаспадарцы ўжо завершана.

Чым хутчэй мы даб'емся новага ўздыму сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, тым вярней забясьпечым бальшавіцкія тэмпы, далейшыя перамогі сацыялістычнай індустрыі, забясьпечым завяршэньне тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі ў другой пяцігодцы.

Зусім відавочна таму, што **пытаньні работы камсамолу ў вёсцы, работа камсамольскіх ячэек у саўгасах, МТС, калгасах на бліжэйшы пэрыяд будуць мець ня меншае значэньне, чым гераічная барацьба камсамолу за хутчэйшае сканчэньне новапабудоў, за аўладаньне тэхнікай новых гіганцкіх доменных печаў** і г. д.

Камсамол вёскі колькасна ўзрос і прадстаўляе там значную сілу. Ён можа аказаць вялізарную дапамогу партыйным ячэйкам у справе растлумачэньня і правядзеньня дырэктыў партыі і ўраду аб мяса-і збожжа-загатоўках, аб разгортваньні калгаснага гандлю, аб захаваньні і разьвіцьці конскага пагалоўя. Камсамол павінен таксама адыграць значную ролю ў пасьпяховым правядзеньні ўборачнай і збожжазагатоўчай кампаніі.

Вялікія задачы стаяць перад камсамолам у справе арганізацыі працы і спаборніцтва ў саўгасах, МТС, калгасах. Умацаваньне брыгад, правільная арганізацыя ўлку, барацьба за аўладаньне агратэхнікай і зоатэхнікай за ўсе агранамічныя паказальнікі, за сацыялістычныя адносіны да сродкаў вытворчасьці, да машын, да жывой цягавай сілы, барацьба за правільнае разьмеркаваньне даходаў і падрыхтоўку кадраў спэцыялістаў сацыялістычнага зямляробства, барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў — такавы задачы камсамолу ў барацьбе за далейшы ўздым сацыялістычнага зямляробства.

Умацаваць рады камсамолу ў горадзе і асабліва ў вёсцы, павысіць іх баяздольнасьць і ў арганізацыйных і ў ідэйна-палітычных адносінах—важнейшая задача камсамольскіх арганізацый.

Што паказаў абмен камсамольскіх білетаў у вясковых арганізацыях? Побач з агульным павышэньнем актыўнасьці моладзі, якая выявілася, у прыватнасьці, у шырокай хвалі самаабавязацельстваў на больш актыўным удзеле ў сацыялістычным будаўніцтве, абмен білетаў выкрыў таксама немала недахопаў, адмоўных бакоў у рабоце камсамольскіх арганізацый. На гэтыя сур'ёзныя недахопы нельга закрываць вочы, нельга ад іх адмахвацца.

«... У працэсе абмену камсамольскіх білетаў выразна выкрыліся канкрэтныя формы барацьбы клясавароўскіх элемэнтаў за ўплыў на моладзь і, у прыватнасьці, прасякненьне гэтых элемэнтаў у рады камсамолу. Выкрыт рад выпадкаў засьмечанасьці вясковых ячэек саюзу кулацкай моладзьдзю (станіца Новарагоўская, Мінэраўцінскага раёну, Паўночна-Каўкаскага краю)» (з пастановы ЦК УсеЛКСМ аб ходзе абмену камсамольскіх білетаў).

Некаторыя арганізацыі саюзу недаўлічылі палітычны сэнс абмену білетаў, невыстарчальна змагаюцца супроць засьмечаньня радоў камсамолу чужымі элемэнтамі, невыстарчальна выяўляюць агентуру клясавага ворага, якая прабуе прасякнуць у паасобныя ячэйкі камсамолу, асабліва ў вясковыя.

Яшчэ больш павысіць ва ўсіх зьвешьнях камсамолу клясавую пільнасьць, павесьці рашучую барацьбу з правымі і «левымі» апартуністамі, бязьлітасна выкрываць усялякія спробы клясавага ворага скарыстаць камсамол, як ступень, праз якую клясавы вораг прабуе ўцерціся ў давер'е партыі і нават часамі пралезьці ў яе рады, — такі адзін з важнейшых вынікаў абмену камсамольскіх білетаў.

Рост камсамолу за апошнія гады ставіць з асабліваю вострасьцю задачу ідэйна-палітычнага выхаваньня, асабліва ў вёсцы. Мы нярэдка сустракаем факты, калі нават на буйных прадпрыемствах камсамольцы, зьяўляючыся перадавікамі вытворчасьці, палітычна вельмі слаба разьвіты, ня чытаюць газэты і г. д. Але яшчэ больш такіх прыкладаў можна знайсьці ў вёсцы. Таму, каб узьняць кіраўніцтва пралетарскага ядра ў камсамоле, **трэба ўсямерна ўзмацніць палітыка-выхаваўчую работу ў вясковых ячэйках камсамолу, якім нярэдка даводзіцца сустракацца з больш складаным клясавым пераплётам, чым вытворчым ячэйкам. Больш кніг, добрых, надзенных папулярных брашур, газэт камсамолу вёсцы!**

За апошні год ёсьць некаторы зрух у бок павышэньня ролі камсамолу ў калгаснай вытворчасьці. Напрыклад, па Сярэдняй Волзе на 1 красавіка 1931 году было 374 камсамольцы члены праўленьняў калгасаў, а зараз стала 926, старшынь праўленьняў калгасаў было 46, стала 187; камсамольцаў, загадчыкаў жывёлагадоўчымі фэрмамі, было 23, стала 102; конюхаў было 104, стала 4.122.

Аднак, увага вельмі многіх камсамольскіх ячэек вёскі яшчэ не сканцэнтравана на пытаньнях саўгаснай і калгаснай вытворчасьці. Арганізацыя працы, разьмеркаваньне даходаў, разьвіцьцё і якаснае ўмацаваньне сац спаборніцтва і ўдарніцтва дагэтуль ня сталі яшчэ цэнтральнымі пытаньнямі штодзённай работы камсамольскіх ячэек. Слаба ўлічваюцца і пашыраюцца лепшыя ўзоры барацьбы камсамольскіх ячэек за аўладаньне агратэхнікай, за лепшую арганізацыю працы і т. д. Не наладжана яшчэ ў патрэбнай меры жывое інструктаваньне саўгасных і калгасных ячэек камсамолу.

У вельмі многіх ячэйках невыстарчальна правільна расстаўлены сілы камсамольцаў; нярэдка камсамольцы адцягваюцца ад вытворчасьці на пязначныя работы ў парадку «вылучэньня».

VII канфэрэнцыя УсеЛКСМ павінна адыграць вялізарную ролю ў далейшым разьвіцьці сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод камсамолу як у сацыялістычнай індустрыі, так і ў сацыялістычным зямляробстве ў карэнным паляпшэньні ўсёй выхаваўчай работы саюзу.

Партыйныя арганізацыі, улічваючы новы склад камсамольцаў, задачы, пастаўленыя перад імі, павінны ўсямерна ўзмацніць канкрэтную дапамогу і кіраўніцтва камсамольскімі арганізацыямі, зьвярнуць **асаблівую ўвагу на камсамольскія ячэйкі вёскі** для таго, каб пастановы, вынесеныя канфэрэнцыяй, былі поўнасьцю і як можна хутчэй рэалізаваны. («Правда»).

АПОШНІЯ ВЕСТКІ З ФРОНТУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Бярэзінскі камбінат перавыканаў прамфінплян 1-га паўгодзьдзя

РАПАРТ

ЦК КП(б)Б—тав. Гікало, СНК—тав. Галадзеду, Наркамлёгпрам—тав. Грысевічу, ЦСПСБ—тав. Кавалёву

Бярэзінскі камбінат у складзе прадпрыемстваў: запалкавая фабрыка «Пралетарская перамога», фанэрны завод «Чырвоная Бярэзіна» і цэнтральная раённая электрастанцыя імя Леніна — выканаў прамфінплян 1-га кварталу на 101 проц., другі квартал скончаны з перавыкананьнем праграмы па запалках — на 103,5 проц., пры кармальнай рабоце электрастанцыі.

Запалкавая фабрыка **«ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА»** ўключылася за ўсесаюзны конкурс на лепшае прадпрыемства; прамфінплян другога кварталу выканан датэрмінова. Рост вытворчасьці за другі квартал гэтага году, параўнальна з мінулым годам, складае па запалкавай фабрыцы — 32 проц., фанэрным заводзе — 19 проц., па ЦЭС — 41 проц.

Плян росту прадукцыйнасьці працы выканан на 107 проц. па запалках і на 104 проц. па фанэрным заводзе. Электрастанцыя зьнізіла сабекошт па энэргіі і пары на 11 проц. Перавыдатку заработнай платы няма. Сырцом камбінат забясьпечан.

Такіх посьпехаў камбінат мог дабіцца, дзякуючы правільнаму кіраўніцтву ЦК КП(б)Б, райкому КП(б)Б і мясцовай партарганізацыі на аснове барацьбы ўсяго рабочага калектыву за ажыцьцяўленьне 6-ці гістарычных указаньняў тав. Сталіна.

3-га ліпеня запалкавая фабрыка і фанэрны завод спыняюцца на рамонт і для некаторай рэканструкцыі прадпрыемстваў у сувязі з пераходам на работу цалкам на экспарт. Мабілізуем рабочы калектыў на сваячасовае сканчэньне рамонту, зьмяншэньне браку, тэхнічных простояў і арганізацыю выпуску прадметаў шырокага спажываньня з адкідаў вытворчасьці.

Дырэктар камбінату—ІЗАКАЎ.
Сакратар парткалектыву — ЕФІМЕНКА.
Старшыня фабкому—ГАЙДУК.

Сельгасмашыны

Завод **Гомсельмаш** за 27 чэрвеня выпусьціў 32 сіласарэзкі «Папэк», што складае 106,7 проц. дзённага заданьня і 24 сачкарні—141 проц.

***

За 26 чэрвеня завод **«Чырвоны мяталіст»** выканаў вытворчую праграму за дзень на 29,5 проц.

Зроблена 7 жмыхадрабілак, 8 бульбакапалак, 6 барон «Зіг-Заг».

27 выпушчана машын на 5.900 руб., або 38 проц. заданьня за дзень.

Зроблена 6 жмыхадрабілак, 14 бульбакапалак, 12 барон «Зіг-Заг».

На БелДРЭС

1-я Белдрэс імя Сталіна 26 чэрвеня выпрацавала 132 тыс. клв. гадзін электраэнэргіі, што складае 82,5 проц. дзённай праграмы. Максымум дасягнуў 6.500 клв.

27 выпрацавана электраэнэргіі 123 тыс. клв., або 76,8 проц. Максымум—6.250 клв. 28 га выпрацавана 129 тыс. клв. гадзін электраэнэргіі—80,6 проц. Максымум раўняўся 6.500 клв.

Будматар'ялы

Рагачоўскі лесазавод **імя Халтурына** за 27 чэрвеня расьпілаваў 330,32 куб. м. бярвэньняў замест плянавых 288 кбм., што дае 114,7 проц. заданьня за дзень.

***

Заводам «Чырвоны Кастрычнік» дзённая праграма за 29 чэрвеня выканана на 38,6 проц. Выпрацавана 2,66 тоны будаўнічых цьвікоў.

Рэалізацыя пазыкі „4-ты завяршальны"

Гомель, Ворша, Мазыр, Койданава перавыканалі заданьне па рэалізацыі пазыкі

Па іх прыкладу ўдарнымі тэмпамі завяршыць падпісную кампанію

Па-баявому правесьці конкурс спаборніцтва

ПЕРАДАВЫЯ гарады і раёны БССР паказалі ЎЗОРЫ БАЛЬШАВІЦКІЯ РАБОТЫ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ пазыкі «Чацьвертага, завяршальнага году пяцігодкі». КОЙДАНАЎСКІ, ЖЫТКАВІЦКІ, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ, ЛАГОЙСКІ, МСЬЦІСЛАЎСКІ, РАСОНСКІ, СТАРОБІНСКІ, ТУРАЎСКІ і інш. раёны ня толькі выканалі, але і ПЕРАВЫКАНАЛІ пляны рэалізацыі пазыкі сярод гарадзкога насельніцтва.

Гэтыя посьпехі зьяўляюцца яркімі сьведкамі таго, што пры правільным і шырокім разгортваньні МАСАВА-РАСТЛУМАЧАЛЬНАЙ РАБОТЫ І ЗАБЕСЬПЯЧОНЬНІ ГІБКАГА, ЖЫВОГА КІРАЎНІЦТВА, можна дабіцца поўнага выкананьня заданьня па пазыцы. Між тым, іменна слабасьць і невыстарчальная глыбіня масава - растлумачальнай работы ў радзе раёнаў і прывялі да таго, што БССР на 1 ліпеня рэалізавала ўсяго 58,5 проц. (па гарадох — 81,2 проц.).

АСАБЛІВА СЛАБА ІДЗЕ РЭАЛІЗАЦЫЯ ПАЗЫКІ ПА КАЛГАСНЫМ І АДНААСОБНЫМ СЭКТАРОХ. 29,4 проц. пляну далі калгасьнікі. Яшчэ менш аднаасобнікі. Толькі АПАРТУНІСТЫЧНАЙ СТАЎКАЙ НА САМАЦЁК у радзе раёнаў можна тлумачыць прычыны такога здаставаньня. Тым больш недапушчальным яна зьяўляецца на фоне надзвычай добрай работы КОЙДАНАЎСКАГА ПОЛЬСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА РАЁНУ, які першым у БССР даў 104,7 проц. пляну, выканаўшы яго па ўсіх групах насельніцтва. За КОЙДАНАВАМ ідуць КЛІМАВІЧЫ, якія далі па калгасным сэктары 79,8 проц. і ВОРША — 76,7 проц. і г. д.

Але такіх раёнаў пакуль мала. Большасьць значна адстае.

Зусім ясна, што за такое адставаньне ў значнай ступені НЯСЕ АДКАЗНАСЬЦЬ І РАЁННЫ І НІЗАВЫ ДРУК.

Таму трэба асабліва вітаць ініцыятыву НАРКАМФІНУ І РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ «РАБСЕЛЬКОР», якія абвясьцілі З 5 ДА 25 ЛІПЕНЯ КОНКУРС-СПАБОРНІЦТВА РАЁННАГА І НІЗАВГОА ДРУКУ НА ЛЕПШУЮ РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАЗЫКІ НА ВЁСЦЫ. Гэты конкурс набывае вельмі важнае значэньне. Ён павінен мабілізаваць усю пралетарскую грамадзкасьць, усіх ударнікаў фінфронту, усіх працоўных на барацьбу за 100 проц. рэалізацыю пазыкі.

РАЙКОМЫ КП(б)Б павінны забясьпечыць ВЫСОКІ ПАЛІТЫЧНЫ УЗРОВЕНЬ ГЭТАГА КОНКУРСУ, забясьпечыць яго баявое правядзеньне, яго РЭАЛЬНЫЯ ВЫНІКІ. Конкурс раённага і нізавога друку павінен ператварыцца ў МАСАВЫ ПАХОД РАБОЧЫХ І ПРАЦОЎНЫХ МАС, пад кіраўніцтвам сваіх партарганізацый ЗА ВЫКАНАНЬНЕ КАНТРОЛЬНЫХ ЗАДАНЬНЯЎ ПА ПАЗЫЦЫ.

ВЯЛІКАЯ АДКАЗНАСЬЦЬ за пасьпяховае правядзеньне конкурсу ЎСКЛАДАЕЦЦА НА ЎВЕСЬ ЦЭНТРАЛЬНЫ І РАЁННЫ ДРУК, які павінен забясьпечыць сыстэматычную апэрацыйную дапамогу і кіраўніцтва нізавым друкам, перадачу лепшага вопыту, актыўны непасрэдны ўдзел у правядзеньні конкурсу.

НА ФАРБЫЧНА- ЗАВОДЗКІ ДРУК, А ЗНАЧЫЦЬ, НА ПАРТЫЙНЫЯ І ПРАФАРГАНІЗАЦЫІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, на ўсю пралетарскую грамадзкасьць гораду ўскладаецца задача мабілізаваць усе сілы грамадзкай узьдзейнасьці, выкарыстаць лепшыя ўзоры выкананьня заданьняў у сяле на фабрыках, заводах і ўстановах для забясьпячэньня пасьпяховай рэалізацыі пазыкі ў падшэфных калгасах і сельсаветах.

Правядзеньне конкурсу павінна суправодзіцца ЯШЧЭ БОЛЬШЫМ ПАГЛЫБЛЕНЬНЕМ І ПАШЫРЭНЬНЕМ МАСАВА - РАСТЛУМАЧАЛЬНАЙ РАБОТЫ, ЦЯРПЛІВАЙ, НАСТОЙЛІВАЙ РАБОТАЙ У ГУШЧЫ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ.

НЕ ДАПУСКАЦЬ КАМАНДАВАНЬНЯ, НЕ ДАПУСКАЦЬ НАВАТ МАЛЕЙШАГА ПРАЯЎЛЕНЬНЯ АДМІНІСТРАВАНЬНЯ І ПРЫМУСУ — адна з абавязковых умоў пасьпяховага правядзеньня конкурсу.

Конкурс-спаборніцтва павінен прайсьці пад знакам ДАЛЕЙШАГА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ ПАРТЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА НІЗАВЫМ ДРУКАМ, узмацненьня дапамогі яму ў вырашэньні адназьнейшых задач, якія ўскладаюцца на яго партыяй.

ПАСЬПЯХОВА ПРАВЕСЬЦІ КОНКУРС - СПАБОРНІЦТВА РАЁННАГА І НІЗАВОГА ДРУКУ, МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЕ СІЛЫ НА БАРАЦЬБУ ЗА РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАЗЫКІ НА ВЁСЦЫ — АДКАЗНЕЙШАЯ І ПАЧЭСНАЯ ЗАДАЧА ЎСІХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ, УСЯГО ЦЭНТРАЛЬНАГА, РАЁННАГА І НІЗАВОГА ДРУКУ, УСЁЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ.

Перамога Гомелю

Пленуму ЦК КП(б)Б, СНК, ЦВК, ЦСПСБ, НКФ, „Зьвязьдзе"

РАПАРТ

Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і Гомельскай партарганізацыі, пры актыўным удзеле камсамольскіх, прафсаюзных і савецкіх арганізацый, шляхам разгортваньня шырокай масава-палітычнай работы, пралетарыят Гомельшчыны атрымаў яшчэ адну перамогу. Заданьне па рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых у суме 4.700 тыс. руб. выкананa на 30 чэрвеня ў разьмеры 4.719 тыс. руб., што складае 100,4 проц. Працягваем работу па ахопе ўсіх працоўных і ўзмацняльні тэмпаў рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

Гарком—**Хлеўнікаў**; Гарсавет—**Браўкевіч**; Гарпрафсавет — **Беленькі**; «Палеская Праўда»—**Зельманаў**; Райфа — **Карпман.**

Сацспаборніцтва гарадоў БССР на лепшую рэалізацыю

(Паводле даных на 1 ліпеня, ў тысячах руб.)

ПАЗВА ГОРАДУ	Сума падпіскі рабочых і служачых	Проц. выкананьня заданьня
1. Койданава	245	144,1
2. Мазыр	700	114,8
3. Ворша	1.263	101
4. Гомель	4.719	100,4
5. Менск	7.858	90,3
6. Віцебск	4.096	88,1
7. Бабруйск	1.978	83,8
8. Рэчыца	773	80,5
9. Барысаў	1.142	76,1
10. Магілеў	1.771	69,2

***

Да 1-га ліпеня рэалізавана па БССР пазыкі на 39.508 тыс. руб.—**58,5 проц. заданьня.** Сярод рабочых і служачых рэалізавана 34.011 тыс.—80,4 проц. Сярод неарганізаванага насельніцтва гарадоў—.926 тыс. руб.—48,8 проц. Падпіска па калгасах дала 2.469 тыс. руб.—29,4 проц. Сярод аднаасобнікаў рэалізавана аблігацый толькі на 102 тыс. руб.

Апрача таго падпіска сярод рабочых і служачых чыгункі **дала 4.850** тыс. Разам з гэтай сумай падпіска па БССР дала—44.358 тыс. руб., або 63,2 проц. заданьня.

Пяцідзеньнік праверкі гатоўнасьці да ўборкі

Поліва—адказьнейшы этап у барацьбе за ўраджай

Пустазельле пагражае глускім гародам

Пырнік і сьвірэпка наступаюць на глускія гароды, пагражаючы зьнішчыць намаганьні калгасьнікаў у часе весьпавой сяўбы. Агародам пагражае пустазельле.

Калі падыходзіш да гароду калгасу «Рэвалюцыйны выбух», буйнейшага ў раёне, дык замест гародніны кідаецца ў вочы суцэльны масыў сьвірэпкі, якая заглушае гародніну.

У калгасе «Рэвалюцыйны выбух» трэба прапалоць 23 га гароду, 6 га махоркі і 2 га проса. Дагэтуль не прапалаты амаль ні адзін гэктар. З 59 жанчын, якія ёсьць у калгасе, на працу выходзяць ня больш 20, а з 53 мужчын — толькі 40.

Работа на полізе зусім не арганізавана. Жанчыны працуюць скопам. Некаторыя, якія добрасумленна адносяцца да работы, канчаюць свой загон раней і па некалькі гадзін ляжаць на траве, пакуль скончаць астатнія.

— Чаму вы не працуеце? — запытаў я ў калгасьніц **Нікіцінай, Вішнеўскай, Карповіч і Бабковай.**

— У нас зьдзельшчыны няма, працуем падзенна. Выйдзеш на працу ў 9 гадзін ці ў 12 — усё-роўна ў канцылярыі паставяць палачку, дык навошта нам лішняе за іх працаваць.

Другі месяц, як праўленьне абяцае перавесьці іх на зьдзельшчыну, але ніяк ня можа склікаць сход. Так марна трацяцца сотні каштоўнейшых гадзін у самы разгар поліва.

Вытворчыя брыгады з-за адсутнасьці масавай работы як з боку кіраўніцтва калгасу, так і з боку зямельных арганізацый, амаль распаліся. Аналёгічнае становішча і ў радзе іншых калгасаў раёну.

Па Глушчыне трэба прапалоць 833 га гароду, 700 га ільну, 1.133 га проса і 116 га махоркі. Гэтыя лічбы ўскладаюць на раённыя арганізацыі вялізарнейшую адказнасьць за становішча пасеваў, за будучы ўраджай. Райза і райкалгассаюз настойліва запэўняюць, што першае поліва ўжо скончана. У сапраўднасьці-ж ніякіх востак аб тым, як праходзіць поліва па раёне няма. Ні райза, ні райкалгассаюз не вядуць апэрацыйнага ўліку.

Полівам у раёне мала хто цікавіцца. Тры аграномы займаюцца толькі канцылярскай перапіскай.

Такая бязьдзейнасьць далей нецярпіма. Надыходзіць пяцідзёнка вырашае посьпех поліва і ўзьняцьця ўраджайнасьці.

С. Б.

„Райза—для выкананьня"

БАБРУЙСК. (Наш спэцкор).

Раённыя арганізацыі бюракратычна адносьліся да вырашэньня важнейшай задачы — стварэньня моцнай кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Яшчэ 2 красавіка праўленьне калгасу **«Чырвоная Беларусь»,** Цялускага сельсавету, зьвярнулася ў РВК з просьбай адвесьці для МТФ 80 га сенажаці. Старшыня РВК тав. **Сьцяпанаў** паслаў заяву **«Райза — для выканьня».** Загадчык райза **т. Жданові**ч накіроўвае заяву далей — **«тав. Ільліну адшукаць сенажаць і забясьпечыць».** І толькі 6 мая гэтая заява са шматлікімі рэзалюцыямі прышла ў Цялускі сельсавет з новай прыпіскай: **«Трэба прыняць захады, каб калгас быў забясьпечан патрэбнай колькасьцю сенажацяй».**

Прайшоў пачатак касьбы, надыходзіць канец, а сенажаці няма. Ніхто ня думае аб тым, што калгасу детась давялося купіць кармоў на 11 тыс. руб. Гэта моцна біла па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасу.

А што робіць дырэкцыя Цялускай МТС? Якія яна захады ўжывае для забесьпячэньня калгасаў кармамі?

Чыноўнікі з апарату МТС доўга набюракратычнаму мудрагельствавалі над складаньнем пляну касьбы і сіласаваньня. Нарэшце, толькі нядаўна, 29 чэрвеня, плян быў... спушчан калгасам у выглядзе звычайнага абежніка. Ніводнага жывога слова на мясцох ад работнікаў МТС не пачулі.

Дырэкцыя плян даслала 29 чэрвеня (са спазьненьнем мінімум на 15 дзён), а прапануе — пачаць касьбу канюшыны 18 чэрвеня і скончыць 30. І гэта называецца канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва.

Але пэрлы кіраўніцтва «наогул» ня ў гэтым. Дырэкцыя МТС прапануе калгасу «Чырвоная Беларусь» — скасіць 16 га канюшыны і накасіць з іх 400 (!?) тон сена, правесьці паўторны ўкос 11 га канюшыны і накасіць 110 (!?) тон. Выходзіць, што трэба накасіць з аднаго та пры першым укосе... 25 тон і пры другім... 10 тон.

Плянавікі, мусіць, пераблыталі тоны з цэнтнэрамі. Мала таго, МТС прапануе калгасу скасіць 75 га сенажаці ў той час, як ёсьць усяго толькі... 27 га. Тут ужо ні ў якім разе нельга дапусьціць тэхнічнай памылкі.

Каму і для чаго патрэбны такія пляны? Яны патрэбны толькі апартуністам Цялускай МТС для таго, каб паказаць, што на паперы з кармамі справа стаіць вельмі добра. Гэта — горшы від кіраўніцтва «наогул», кіраўніцтва казённага, благадушнага і нікому не патрэбнага.

У выніку бюракратычнай цеганіны райарганізацыі, чыноўніцкага кіраўніцтва МТС — стварэньне кармовай базы для МТФ калгасу «Чырвоная Беларусь» над пагрозай зрыву.

Прыгарадныя гаспадаркі чакаюць дапамогі гомельскага гарпрафсавету

ГОМЕЛЬ. (Наш. кар.). 610 га гародаў, 604 га палявых культур і звыш 15 тыс. га бульбы чакаюць поліва і акучкі. Каб атрымаць добры ўраджай, трэба пільна даглядаць за пасевамі, не дапускаць, каб гароды і палі зарасталі пустазельлем.

Прыклад барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці шляхам сваячасовага правядзеньня поліва паказвае Гомельскі сельгаскамбінат. Поліва столовых буракоў ужо выканана на 99 проц., раньняй капусты—на 60 проц., памідораў—на 65 проц. Акучка бульбы выканана на 52,6 проц.

Сельгаскамбінату штодзённа не хапае для праполкі 416 чал. Гомельскія прафсаюзныя арганізацыі вельмі павольна арганізоўваюць дапамогу калгасам шляхам адпрацоўкі рабочымі прадпрыемстваў пэўнай колькасьці дзён на палёх. Сярод рабочых ніякай растлумачальнай работы не вядзецца.

Зусім не наладжана падвозка рабочых у калгасы. Гэтымі днямі рабочыя фабрык **«Казімі»** і **«Праца»** 2 гадзіны прачакалі аўтобуса для паездкі ў сельгаскамбінат. Назад ім прышлося ісьці пехатою.

Рабочай сілы для поліва не хапае і ў іншых прыгарадных гаспадарках Гомельшчыны.

Зараз с.-г. камбінат заключае з прадпрыемствамі гораду дагавары з тым, каб рабочыя адпрацавалі ў часе поліва і ўборкі пэўную колькасьць дзён, за што яны атрымаюць сельгаспрадукты адпаведна сваёй рабоце на палёх.

Прыгарадныя гаспадаркі Гомельшчыны патрабуюць ад гарпрафсавету канкрэтнай рэальнай дапамогі, не на словах, ні ў рэзалюцыях, а на справе.

***

Гомельская МТС у часе пасеўнай была ў глыбокім тыле. Але ўрокі сяўбы кіраўніцтвам МТС ня ўлічаны. Зараз яна адстае і з полівам. Тлумачыцца гэта адсутнасьцю належнага кіраўніцтва і апартуністычнай стаўкай на самацёк.

Дырэктар МТС тав. **Віталь** яўна не адпавядае свайму прызначэньню. Гэта выявілася і ў часе сяўбы. Увесь апарат МТС разьвінчаў, ніхто ня ведае, што трэба рабіць. Работнікі МТС не адчуваюць ніякай адказнасьці за даручаную ім справу. Старшы агранам **Буракевіч** зараз, калі поліва ў разгары, выступае з заявай, што «гутарка аб полізе ісьці ня можа, бо сяўба яшчэ ня скончана». МТС ня мае яшчэ плянаў прапалочна-ўборачнай кампаніі, ня маюць іх і калгасы.

Парт'ячэйка МТС пытаньнямі поліва і ўборкі дагэтуль не займалася. Ёсьць рэальная пагроза зрыву поліва па калгасах раёну дзейнасьці МТС. Трэба безадкладна ўжыць меры да Гомельскай МТС.

Гафт, Гасман.

Уваравіцкія арганізацыі ня турбуюцца

УВАРАВІЧЫ. (Наш кар.). Выканаўшы пасеўны плян толькі на 84 проц., раённыя арганізацыі павінны былі ўжыць усе захады для таго, каб перакрыць недасеў добраякасным правядзеньнем прапалочнай і ўборачнай кампаніі.

Аднак, як райза, райкалгассаюз, так і іншыя раённыя органы асабліва ня турбуюцца. Па калгасах трэба абараць бульбы 2.957 га, прапалоць гародаў — 278 га, ільну — 1.052 га, ільніцы — 324 га. Аспоўная маса калгасаў да гэтай працы яшчэ не прыступіла.

Райза і райкалгассаюз зусім ня ведаюць становішча з ходам поліва і падрыхтоўкай да ўборачнай кампаніі. Вестак калгасы не прадстаўляюць, а райза іх і не патрабуе.

У калгасе імя **Зигельса** з 25 га гароду прапалота толькі 8 га. Буракі і морква зарасьлі пустазельлем і знаходзяцца пад пагрозай пагібелі. **На працу з 154 чал. выходзіць толькі 40.** Жанчыны, замест работы на полі, ходзяць у лес па суніцы.

Партыйная ячэйка літаральна бязьдзейнічае і ня ўжывае ніякіх захадаў, каб мабілізаваць калгасьнікаў калгасу імя Энгельса на сваячасовае правядзеньне поліва і правядзеньне ўборачнай кампаніі.

Раённае парткіраўніцтва павінна ўлічыць ур

ЛІКВІДАВАЦЬ АДСТАВАНЬНЕ ПАПЯРОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР

ПОЎНАСЬЦЮ ЗАДАВОЛІЦЬ ЗАПАТРАБАВАНЬНІ РАЗГОРНУТАГА КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА

ВЫПРАЦОЎКА ПАПЕРЫ ПА АСНОЎНЫХ ПАПЯРОВЫХ ФАБРЫКАХ БССР

(За другую дэкаду чэрвеня)

Выраблена паперы (у тонах і процантах)

„Герой працы" (Добруш)	„Спартак" (Шклоў)	„Чырвоная зорка" (Чашнікі)
570	150	583
67	83	49

Запазычанасьць краіне

278 тон	31 тона	616 тон

Заўвага: па „Чырвонай зорцы" пічбы даны за ўвесь чэрвень.

Аплаціць доўг краіне

Папяровая прамысловасьць, работа якой адыгрывае выключную ролю ў справе разгортваньня культурнай рэвалюцыі, задаваленьня культурна-бытавых патрэб працоўных мас, зьяўляецца самай адсталай галіной вытворчасьці БССР. 7 папяровых фабрык выканалі прамфінплян за першы квартал на 56,9 проц. Назад у параўнаньні з першым квартałам мінулага году выпушчаная прадукцыя раўнялася толькі 83,9 проц., а ў параўнаньні з папярэднім чацьвертым квартałам мінулага году—72,1 проц.

Красавік і май не долі папяпшэньня. Месячная праграма папяровай прамысловасьці ў красавіку выканана на 60,4 проц., у маі—на 67 проц.

У чым прычыны ганебнага адставаньня папяровых фабрык? Ці ёсьць такія «аб'ектыўныя» ўмовы, якія-б маглі апраўдаць дрэнную работу папяровай прамысловасьці? Гэтыя ўмовы не адыгрываюць рашаючай ролі. Практыка перадавых папяровых фабрык—барысаўскай «Прафінтэрн», якая выканала план за май на 102,2 і Рагачоўскай імя Сталіна —на 121,8 проц.—гаворыць аб тым, што прычыны адставаньня карэніцца ў вытворчых непаладках, у няўменьні перабудаваць работу па-новаму. Аб гэтым яскрава сьведчыць параўнаньне работы дзьвюх фабрык: барысаўскай «Прафінтэрн», якая выканала заданьне за май на 102,2, і Чашніцкай—«Чырвоная зорна», якая дала толькі 43 проц.

Пры аналізе работы фабрык кідаюцца ў вочы вялікія прастоі машын. На фабрыцы «Герой працы» машыны зэмест 22,5 гадзіны ў суткі паводле пляну працавалі ў красавіку—18,5, у маі—19,9; на «Чырвонай зорцы»—у красавіку —17,3 гадз., у маі—16,2. Лік адпрацаваных машына-гадзін на фабрыцы «Герой працы», на «Чырвонай зорцы», «Спартаку» значна менш пляну—ён складае 30-40 проц.

Найбольшая колькасьць прастояў выклікана дрэннай дастаўкай палаву. У гэтым вялікая доля віны фабрычных арганізацый. На балоце, якое абслугоўвае «Чырвоную зорку», напрыклад, пяжыць шмат торфу, на станцыі сапляецца вугаль, якім яна вызвоўваецца. Дагэтуль ня скончана пабудова вузкакалейкі. Адміністрацыя тлумачыць гэта адсутнасьцю рэек. Узьнікае пытаньне, ці цяжка было пры належным напружаньні энэргіі і сіл здабыць рэйкі на 4 клм.? Зразумела, што гэта можна было зрабіць. Фабрыка таксама не заверабавала неабходнай колькасьці возчыкаў, і таму кон ны транспарт ня мог абслугоўваць падвозкі.

Такое-ж становішча на добрускай фабрыцы «ГЕРОЙ ПРАЦЫ. Транспарт на папрузачнай не ўпарадкаван, падвесная дарога не забясьпечана запаснымі часткамі. Брыгады торфазаводу не пераведзены на гаспадарчы разрахунак.

Яшчэ адна прычына прастояў—недахват дрыўлянай масы. І тут значная доля віны падае на арганізацыі прадпрыемстваў. Фабрыкі ня здолелі падрыхтаваць патрэбную для вытворчасьці колькасьць дрыўлянай масы і цэлюлёзы. Паўфабрыкатныя цэхі паасобных фабрык ня выканалі сваіх заданьняў. «Герой працы» павінен быў у маі вырабіць 348 тон сапоменай цэлюлёзы. Фактычна выпушчана 248 тон. Трэба было вырабіць 261 тону дрыўлянай масы, вырабілі—38. «Спартак» даў 78 тон масы, замест 261, г. зн. 29,9 проц.

Гэтыя факты паказваюць, што нашы папяровыя фабрыкі яшчэ не перабудавалі поўнасьцю сваёй работы ў адпавед насьці з 6-ю ўмовамі тав. Сталіна. Арганізацыя працы на прадпрыемствах пастаўлена нездавальняюча, мала ўвагі аддаелася партыйна-масавай палітычнай рабоце сярод рабочых, ня было належных клопатаў аб культурна-бытавым абслугоўваньні рабочых.

Возьмем самую вялікую фабрыку «Герой працы». На ёй яшчэ не ліквідавана абязьлічка. Да гэтага часу працягваюцца перамёдкі рабочых з аднаго агрэгату на другі, а гэта выклікае паломкі, прастоі, няўважлівыя адносіны да мэханізмаў. Часта гараць падшыпнікі. Вельмі нізкая якасьць рамонту. На сілавой станцыі стаіць турбіна; ніхто не паклапоціцца, каб ачысьціць паветраны фільтр, які забіт пылам. Галоўны мясьпянік падстанцыі патрабуе рамонту, але яго не спраўляюць, а гэта пагражае выбухам.

Сталоўка яшчэ працуе вельмі дрэнна.

Неабходна завастрыць увагу на пытаньні аб будматар'ялах. Пуск сапомацэлюлёзнага заводу ў Добрушы затрымліваецца з-за недахвату матар'ялу. Трэба дабіцца забясьпячэньня будаўніцтва матар'ялямі, а таксама фарсаваць пабудову дрыўляна-маснага заводу на «Прафінтэрне».

Сацыялістычная краіна чакае ад папяровай прамысловасьці, ліквідацыі запазычанасьці ў тысячы тон паперы.

Шырокае разгортваньне сацыялістычных мэтадаў працы, сапраўднае пераключэньне на выкананьне шасьці ўмоў тав. Сталіна вывядуць папяровыя фабрыкі з тылу, у якім яны зараз знаходзяцца.

А. Л.

Чаму адстае фабрыка імя Вароўскага

Ліст рабкораў

СУРАЖ. Кардонная фабрыка імя Вароўскага па працягу 5 месяцаў сыстэматычна ня выконвае прамфінпляну. У лютым яна дала прадукцыі на 82 проц. пляну, у сакавіку—на 83,5, у красавіку — на 79,1 і ў маі — на 98,4 проц.

На вытворчасьці існуе абязьлічка і ўраўнілаўка. Штодня рабочыя перакідваюцца з аднаго цэху ў другі, з аднаго варштату да другога, штаты не ўкамплектаваны. Гэтым тлумачыцца недавыпарка балянсу, што ў сваю чаргу выклікае адставаньне ў выкананьні прамфінпляну. Улік работы ўдарнікаў не наладжаны, вынікі сацспаборніцтва невядомы.

Першая дэкада чэрвеня, калі плян быў выкананы на 115 проц., паказала, што добрая выпарка балянсу дае патрэбныя вынікі.

На фабрыцы ёсьць каля 35-40 тон сырой, нявысушанай дрыўлянай масы. На дварэ фабрыкі, каля летняй сушні, валяецца сырая прадукцыя зімовай выпрацоўкі. Ня гледзячы на добрае надвор'е, дрыўляная маса сушыцца парай, а летняя сушня не скарыстоўваецца.

З лістапада мінулага году фабрыка пераведзена на цэхавы гаспадарчы разрахунак. На працягу ўсяго гэтага пэрыяду ні дырэкцыя, ні цэхавая адміністрацыя не правяралі вынікаў гаспадарчага разрахунку. Выдатак балянсу на адну тону дрыўлянай масы, замест плянавых 3 р. 90 кап., дасягнуў 4 р. 50 кап. Гатовая прадукцыя не адгружаецца; з-за адсутнасьці ўпакаванай прадукцыі лайбы два разы ўшлі недагружанымі.

Двор фабрыкі завален адкідамі дасаматар'ялаў, якія маглі-бы быць скарыстаны для вырабу прадметаў шырокага спажываньня і ў якасьці апалу.

Сураскі райспажыўсаюз і Пудоцкае спажывецкае таварыства дрэнна снабжаюць рабочых. Пайкі выдаюцца несваячасова і з вялікім спазьненьнем. Патрэбна неадкладная перабудова работы на фабрыцы.

Ударнікі. (3 подпісы).

Тав. Кузенкова—прэміяваная ўдарніца панчошна - трыкатажнага камбінату (Віцебск), выконвае норму на 148%

СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЭРАЦЫЯ ДРЭННА ЗМАГАЕЦЦА ЗА РАЗГОРТВАНЬНЕ КАЛГАСНАГА ГАНДЛЮ

Хутчэй прасоўваць тавары шырокага спажываньня ў вёску

(Гутарка са старшынёю Белкаапсаюзу т. Хаскіным)

Старшыня Белкаапсаюзу т. Хаскін у гутарцы з супрацоўнікам Белта пад крэсьліў, што яшчэ ня ўсе зьвеньні сыстэмы БКС уявілі сабе выключнае значэньне калгаснага гандлю і ролю ў гэтай галіне спажывецкай каапэрацыі.

Некаторыя работнікі каапэрацыі адносяцца да калгаснага гандлю і раз гортваньня савецкіх базараў, як да справы, якая ня мае простага дачыненьня да работы каапэрацыі. Толькі не вялікая частка пізавых каапарганізацый аказвае практычную дапамогу калгаснаму гандлю, сапраўды дапамагае савецкім базарам неладжаць работу (Менск, Гомель, Магілеў).

Рад каапэрацыйных работнікаў разважаюць так: «каапарганізацыям не застаецца нічога рабіць у галіне загатовак с.-г. прадуктаў, бо калгась нік усё сам павязе прадаваць па базар» (Хойніцкі раён). Гэтыя «каапэратары» не аказваюць калгасам патрэбнай дапамогі ў прадастаўленьні гандлёвых памяшканьняў, не арганізуюць чайных на базарах, ня прымаюць мер для арганізацыі сустрэчнага гандлю таварамі шырокага спажываньня.

Зразумела, што такія разважаньні і такая практыка ёсьць яркі выраз апартуністычнага супраціўленьня раз гортваньню калгаснага гандлю.

Тыя мерапрыемствы, якія ў сучасны момант партыя прымае ў галіне максымальнага завозу прамтавараў у вёску, павінны рашуча павысіць насычанасьць вёскі прамтаварамі. У пачатку ліпеня **намечана завесьці розных тавараў у вёскі БССР больш чым на 5 млн. руб. Паводле пляну ў трэцім квартале будзе завезена тавараў у сельскія мясцовасьці ў два разы больш, чым у мінулым квартале.** Ня менш 95 проц. гэтых тавараў пройдуць праз гандлёвую сетку спажывецкай каапэрацыі.

Задача сыстэмы БКС заключаецца ў тым, каб нарастаючы таварны паток, які ідзе ў вёску сваячасова прапусьціць праз сваю гандлёвую сетку, **не дапускаючы залежаў і замарожваньня.**

Спажывецкай каапэрацыі неабходна весьці максымальную работу па вышукваньні дадатковых тавараў, па аказаньні практычнай дапамогі саматужнай каапэрацыі і мясцовай прамысловасьці ў пашырэньні вытворчасьці тавараў шырокага спажываньня, па выкараненьні тэндэнцый мэханічнага разьмеркаваньня.

У радзе раёнаў БССР у часе калгасных базараў наглядаюцца выпадкі скрыўленьня палітыкі савецкага гандлю, якія выражаюцца ў абмежаваньні водпуску прамтавараў толькі калгасьнікам, у простых тавараабменных апэрацыях і г. д.

З усімі гэтымі скажэньнямі, якія перашкаджаюць разьвіцьцю калгаснага гандлю іграюць толькі на руку клясаваму ворагу, трэбе весьці рашучую барацьбу. Белкаапсаюз ужо зьняў з работы рад работнікаў каапэрацыі і прыцягвае іх да судовай адказнасьці (Сянно, Слуцак, Ветка, Гарадок).

Неабходна максымальна ажывіць загатоўчую работу каапэрацыі з тым, каб забясьпечыць поўнае выкананьне цэнтралізаваных плянаў загатовак.

Самазагатоўкі павінны праводзіцца спажыўкаапэрацыяй выключна ў глыбіных пунктах і базарах мясцовасьцяй **непрамысловага значэньня.** Самазагатоўкі на базарах прамысловых гарадоў павінны быць спынены.

Ні ў якім разе нельга дапускаць уздуваньня цэн, ажыятажу і спэкуляцыі. Кожнаму работніку сыстэмы БКС трэба памятаць, што спажывецкая каапэрацыя не выступае на рынку як сьляпая сіла, а выступае ў ролі арганізатара, перад якім стаіць задача ўзьдзейнічаць на рынак, спрыяць устанаўленьню правільных адносін з калгасьнікамі, працоўнымі сялянамі і спажыўцамі і гэтым самым уплываць на далейшае зьніжэньне рынкавых цэн.

У разьвіцьці калгаснага гандлю асаблівае значэньне мае **ўмелае і правільнае манэўраваньне таварамі.** Тавар трэба накіраваць туды, і тады, дзе і калі ён будзе даваць максымальную эфэктыўнасьць у сэнсе разьвіцьця прадукцыйных сіл калгасаў, узьнятьця ініцыятывы калгасьніка ў павялічэньні колькасьці с.-г. прадуктаў для рынкаў, у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Вялікім недахопам у рабоце Белкаапсаюзу і ўсёй сыстэмы спажывецкай каапэрацыі БССР зьяўляецца **надзвычай слабая пастаноўка вучоту прасоўваньня тавараў шырокага спажываньня паасобна для вёскі і паасобна для гораду.** Сакратар ЦК УсеКП(б) тав. **Постышаў** у сваім апошнім артыкуле зусім правільна і сваячасова зварачае ўвагу на гэта пытаньне. **Гэты прарыў у нашай работе павінен быць безадкладна ліквідаваны.** Такі абавязак ня толькі Белкаапсаюзу, але і апарату кожнага райсаюзу, кожнага сельспажыўтавары ства.

Толькі тады, калі ўсе недахопы, скрыўленьні ў калгасным гандлі будуць зьнішчаны, толькі тады, калі каапэрацыйна-гандлёвыя работнікі пасапраўднаму, па-бальшавіцку возьмуцца за справу мы зможам поўнасьцю выканаць дырэктывы партыі і ўраду, добра наладзіць калгасны гандаль і ў прыватнасьці работу савецкіх базараў.

Непаваротлівасьцю каапэратараў карыстаецца спэкулянт

СЛУЦАК. (Наш кар.).

Гэтымі днямі адбыўся масавы выезд калгасьнікаў Случчыны на савецкі рынак. Каля 200 калгасных вазоў з рознымі сельска-гаспадарчымі прадуктамі разьмясьціліся на спэцыяльна-адведзенай плошчы. Асабліва многа было малака, малочных прадуктаў і курэй. Калгасы «Першае мая», «Чырвоная зорка» гандлявалі малаком, мясам з ларкоў.

Масавы выезд даў свае станоўчыя вынікі. Цэны на прадукты значна зьнізіліся. Калі раней літр малака каштаваў ад 80 кап. да 1 руб., дык па калгасным рынку ня больш 60 кап., а калгас «Новая ніва», Прошчыцкага сельсавету, прадаў два бітоны малака (70 літраў) па 50 кап. за літр. Масла раней каштавала 8 руб. 90 кап., на калгасным рынку — 6 руб. фунт, сыр адпаведна 5 руб. — 4 руб. 50 к. і 3 руб.

Гарспажыўтаварыства і райпрамсаюз праявілі недапушчальную значэньня разгортваньня калгаснага гандлю і не арганізавалі сустрэчнага гандлю прамтаварамі. Ні гарспажыўтаварыства, ні райпрамсаюз не паклапаціліся арганізаваць продаж тавараў з ларкоў або сталоў. Прыватнік-жа наадварот з вялікім посьпехам прадаваў такія тавары, як мануфактура, сякеры, вілы і г. д.

Нішчо-ж райпрамсаюз, які яднае дзесяткі розных арцеляй — ткацкіх, рымарных, скураных, гончарных, мэталёва-сьлясарных ня змог выкінуць на рынак такія-ж сякеры і вілы? Райпрамсаюз мае ў гэтай галіне вялізарныя магчымасьці, але — ён ня хоча праявіць ініцыятыву і жаданьня. Як відаць кіраўнікі райпрамсаюзу лічаць больш патрэбным, каб гандляваў прыватнік.

Б. Харытончык.

У ТОРФАЗДАБЫЧЫ ПЕРАЛОМУ ЯШЧЭ НЯМА

Удзесяцярыць тэмпы работы ў ліпені—баявая задача ўсіх арганізацый тарфяной прамысловасьці

ЗА ДВА М-ЦЫ НЕДАДАНА КРАІНЕ КАЛЯ 500 ТЫСЯЧ ТОН ТОРФУ

З пачатку торфасэзону прайшло ўжо два месяцы, а тэмпы торфаздабычы ўсё яшчэ на вельмі нізкім узроўні. Па заводах Белторфу выкананьне сутачнага пляну хістаецца ад 30 да 60 проц., Наркамлёгпраму — ад 40 да 65 проц., прамкаапэрацыі — ад 45 да 55 проц. З усіх торфазаводаў БССР поўнага выкананьня сутачнага заданьня дасягнулі толькі тры: «Закрашынскі мох», «Лепінскі шлях» і «Чырвоны тарфянік».

Каляндарны плян па Белторфаб'яднаньні на 29 чэрвеня выканан на 39,7 проц., г. зн., што краіна недаатрымала каля 200 тыс. тон торфу. Па сыстэме Наркамлёгпраму таксама недавыпрацавана больш 50 тыс. тон, прамкаапэрацыі — каля 250 тыс. тон. Разам жа па ўсіх трох сыстэмах запазычанасьць складае каля 500 тыс. тон, або больш 30 проц. усёй гадавой праграмы тарфяной прамысловасьці БССР.

Трэба адзначыць, што як па Белторфу, так і Наркамлёгпраму аснoўная маса недавыпрацоўкі торфу падае на фрэзэрную здабычу, якая зьяўляецца самай адсталай. Так, па заводах Белторфаб'яднаньня фрэзэрнага торфу замест 92 тыс. тон здабыта толькі 7 тыс. тон, або 8,6 проц. каляндарнага пляну, на заводах Наркамлёгпраму замест 41 тыс. тон — 407 тон, або 8,2 проц. каляндарнага пляну.

Такавы зусім нездавальняючыя рэзультаты работы тарфяной прамысловасьці за першыя два месяцы торфасэзону. Чым жа тлумачыцца такое ганебнае адставаньне? Чаму за такі доўгі пэрыяд торфазаводы ня здолелі пабаявому разгарнуць торфаздабычу? Калі ў маі некаторыя заводы нізкія тэмпы работы імкнуліся вытлумачыць наяўнасьцю на балотах мерзьляка, слабай кваліфікацыяй рабочых-навічкоў, дажджлівым надвор'ем, дык у чэрвені ўсе гэтыя аргументы адпалі, а тэмпы торфаздабычы не павысіліся. Значыць нізкіх «аб'ектыўных» прычын ня было і няма. Адставаньне ў торфаздабычы тлумачыцца выключна слабай перабудовай тарфяной прамысловасьці сваёй работы на аснове ажыцьцяўленьня 6-ці ўмоў тав. Сталіна.

ЦК і СНК БССР у сваёй тэлеграме аб узмацненьні тэмпаў торфаздабычы, якая зьмешчана ў «Зьвязьдзе» ад 13 чэрвеня, указалі, што «справа гонару кожнага камуніста, камсамольца, рабочага, інжынэрна - тэхнічнага работніка торфазаводаў ня толькі ліквідаваць у чэрвені прарыў за папярэдні час, але і дамагчыся перавыкананьня пляну па торфаздабычы». На вялікі жаль, гэтае ўказаньне ня выканана. Запазычанасьць краіне ў торфе ня толькі не ліквідавана, але яшчэ больш узрасла.

Ліпень — рашаючы месяц у выкананьні пляну. Таму партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі заводаў у гэтым месяцы павінны мабілізаваць усе сілы па максымальнае ўмацненьне торфаздабычы, каб поўнасьцю ліквідаваць ганебнае адставаньне і забясьпечыць пасьпяховае выкананьне вытворчай праграмы.

23 проц. гадавога пляну—паказальнік слабай работы

Па сыстэме прамкаапэрацыі на 25 чэрвеня здабыта 134.225 тон торфу, што складае 23,1 проц. гадавой праграмы Белкаапрамторфу. За 5 пяцідзеньку чэрвеня здабыта 24.725 тон, або 48 проц. пяцідзеннага заданьня.

Уперадзе ідуць Крычаўскі райпрамсаюз, які на 25 чэрвеня выканаў гадавы плян на 55,2 проц., Горацкі — на 50 проц., і Койданаўскі — на 47 проц.

Ганебна адстаюць Асіповіцкі, Веткаўскі, Полацкі, Мазырскі і Рэчыцкі райпрамсаюзы.

Здабыча торфу заводамі Белторфаб'яднаньня

(у тонах і проц.)

25 чэрвеня	26 чэрвеня	27 чэрвеня	28 чэрвеня	29 чэрвеня
2824	1874	2772	3849	3614
45,5	30,2	44,6	62,0	58,2

К. Верамейчык

За перабудову партработы ў жывёлагадоўчых калгасах

XVI зьезд УсеКП(б), выходзячы з шырока-разгорнутага працэсу сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй сельскай гаспадаркі, паставіў задачу стварэньня моцных парт'ячэек у саўгасах і калгасах.

Апошні зьезд КП(б)Б зьвярнуў увагу ўсіх райпартарганізацый на неабходнасьць забясьпячэньня рашучага пералому ў павароце парт'ячэек саўгасаў тварам да вытворчых задач, на неабходнасьць яшчэ большага павышэньня арганізатарскай і кіруючай ролі камуністаў у сельска-гаспадарчай вытворчасьці, правільнай расстаноўкі сіл, на павышэньне вытворчай кваліфікацыі і аўладаньня вытворчымі працэсамі ўсіні камуністамі. Як паказвае аналіз работы парт'ячэек жывёлагадоўчых саўгасаў, гэтыя дырэктывы партыйнага зьезду поўнасьцю яшчэ ня выкананы. Рад ячэек **не павярнуліся тварам да вытворчых задач, слаба разгарнулі палітычна-масавую работу сярод беспартыйных рабочых.**

Гэта выразна пацьвярджаюць паказальнікі выкананьня пляну здачы саўгасамі сваёй малочнай прадукцыі. Саўгасы Белмалпрамтрэсту ў першым квартале бягучага году выканалі плян па здачы малочнай прадукцыі толькі на 46,5 проц. Рад саўгасаў у бягучую пасеўную кампанію адсталі з правядзеньнем палявых работ. Досыць паказаць на такі факт, што плян веснавой сяўбы на 5 чэрвеня, калі ўжо трэба было выкананць праграмы, выканан быў усяго на 53,4 проц. Асобныя саўгасы даюць проста ганебныя паказальнікі сваёй работы. «Зорка захаду» (Тураўскі раён) выканала плян здачы малака толькі на 12 проц. і мяса на 41,4 проц. «Габрыэлеўка» (Пухавіцкі раён) плян па малаку выканала на 18 проц. і па мясной прадукцыі ня выканан ні на адзін проц. Саўгас «Капацэвічы», Старобінскага раёну, адпаведна на 15 і 50 проц., «Дзедлава», Рагачоўскага раёну—22 і 25 проц.

Чым тлумачыцца такое недапушчальнае недавыкананьне пляну па здачы мясной і малочнай прадукцыі гэтымі саўгасамі?

Для таго, каб перакапацца, што прычыны недавыкананьня крыюцца не ў пераальнасьці пляну, а ў **няўменьні па-новаму арганізаваць вытворчасьць** і ў тэндэнцыях спажывецкага характару прывядзем некалькі параўнаньняў. Пры тых-жа ўмовах, як і пералічаныя вышэй адстаючыя гаспадаркі, **саўгас «Пагост», Старобінскага раёну,** выканаў плян па здачы малака на 129,4 проц., а па здачы мяса—на 187 проц. Аналёгічныя паказальнікі ў гэтым напрамку маюць месца ў саўгасах «Высокае» (Аршанскі раён) «Рачкавічы» (Чырвона-Слабодзкі), «Палажэвічы» (Стара-Дароскі) і інш. У той час, калі саўгас «Уваравічы» пры наяўнасьці 504 кароў атрымаў толькі 258 цэнтн. малака, дык у саўгасе «Пагост», дзе ёсьць толькі 206 кароў, атрымана малака за гэты-ж час —450 цэнтн.

Азнаямленьне з работай раду партыйных арганізацый саўгасаў дае ўсе пад ставы сьцьвярджаць, што асноўнымі прычынамі адставаньня савецкіх гаспадарак зьяўляецца тое, што іх **партыйныя ячэйкі не перабудавалі сваёй работы,** не пераляелі цэнтру цяжару яе ў пізавое зьвяно вытворчасьці, не змагаліся за рэалізацыю 6-ці ўмоў тав. **Сталіна.** У гэтых саўгасах па вядучых вучастках вытворчасьці яшчэ не ліквідавана абязьлічка, вытворчыя брыгады існуюць толькі на паперы. Зямельныя вучасткі і сельска-гаспадарчыя машыны і інвэнтар да іх не прымацаваны. Зусім мала аддаецца ўвагі разгортваньню масава-выхаваўчай работы, сацыялістычным формы і мэтады работы не знайшлі сабе належнага ўкараненьня.

Зусім ня так адносіцца да перабудовы партыйна-масавай работы, да арганізацыі вытворчасьці ячэйка саўгасу «Пагост». Яна перш за ўсё расставіла свае сілы так, каб партыйным уплывам былі забясьпечаны ўсе вытворчыя вучасткі саўгасаў, асабліва па вядучых галінах гаспадаркі. З 32 членаў і кандыдатаў партыі гэтай ячэйкі 27 камуністаў працуюць непасрэдна на вытворчасьці ў брыгадах. У двух паляводчых брыгадах, у трактарным парку, на млыну і скотным дварэ арганізаваны партыйныя групы, якія пад кіраўніцтвам ячэйкі і пры яе дапамозе, разгортваюць на сваіх вытворчых вучастках масава-выхаваўчую работу. Па астатніх брыгадах расстаўлены партыйныя арганізатары.

Значная ўвага з боку бюро ячэйкі была аддана разгортваньню як міжбрыгаднаму, так і ўнутры-брыгаднаму спаборніцтву. Шляхам сыстэматычнай праверкі выкананьня партыйных даручэньняў кожным камуністам, ячэйка дабілася авангарднай ролі членаў і кандыдатаў партыі па ўсіх вытворчых вучастках. Усё гэта спрыяла таму, што зараз звыш 50 проц. рабочых саўгасу абвясьцілі сябе ўдарнікамі. Лепшыя ўзоры работы паказваюць камуністы. З 48 прэміяваных ударнікаў у саўгасе 20 членаў і кандыдатаў партыі.

Паміж асобнымі брыгадамі заключаны дагавары па сацспаборніцтву, у якіх вызначаецца рад канкрэтных сямаабавязацельстваў.

Асаблівую ўвагу ячэйка аддала пытаньню рэалізацыі другой ўмовы тав. **Сталіна** аб паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоў рабочага калектыву. У гэтым напрамку ў саўгасе дасягнуты значныя вынікі. У 1931 годзе саўгасам быў перавыкананы плян жыльлёвага будаўніцтва, у рэзультате чаго амаль усе рабочыя забясьпечаны ня дрэннымі кватэрамі. Значна палепшана грамадзкае харчаваньне. Пры саўгаскім рабочым каапэратыве арганізован сьвінаадкормачны пункт і гадоўля трусоў. Апрача таго, праведзена сярод рабочых саўгасу работа па зборы мэтавага авансу на арганізацыю малочнай фэрмы і разьвядзеньне гусей спэцыяльна для сталоўкі саўгасу.

Ня меншая ўвага зьвернута на тое, каб рабочы калектыў саўгасу меў добрыя ўмовы для культурнага скарыстаньня свайго адпачынку. Амаль кожная кватэра рабочага электрыфікавана, пры клюбе ўстаноўлена стацыянарнае кіно і радыё-вузел, у кватэрах рабочых пастаўлены рэпрадуктары. Рэгулярна праводзяцца сходы рабочых, на якіх вырашаюцца пытаньні, якія найбольш хвалююць рабочых. У саўгасе поўнасьцю ліквідавана пянісьменнасьць. Вынікам гэтай работы ячэйкі зьявілася ліквідацыя цякучасьці рабочай сілы, рост ударніцтва і выкананьне саўгасам абавязкаў перад дзяржавай.

Вось розьніца ў рабоце ячэек. Яна ярка паказвае, што тыя ячэйкі, якія павярнуліся тварам да вытворчых задач і арганізавалі барацьбу за рэалізацыю шасьці сталінскіх умоў, дабіліся посьпехаў у разьвіцьці саўгаснай вытворчасьці. Гэтага павароту павінны дабіцца раённыя камітэты партыі, па ўсіх без выключэньня саўгасных ячэйках.

Адначасова з гэтым трэба папярэдзіць ячэйкі, што паварот да вытворчасьці ні ў якім разе не азначае ўменшаньне кіраўніцкай парт'ячэек ва ўсю бягучую гаспадарчую работу, не азначае падмены дырэкцыі саўгасу.

Правільная расстаноўка партыйных сіл і павышэньне авангарднай ролі камуністаў па вытворчасьці — асноўныя элемэнты партыйна-масавай работы саўгасных ячэек. Аднак, па справе гэтым пытаньнем рад партыйных арганізацый саўгасаў аддае вельмі мала ўвагі. Ня рэдка вядучыя цэхі саўгасаў — жывёлагадоўля застаюцца бяз штодзеннага партыйнага ўплыву. У буйнейшым саўгасе Хойніцкага раёну — «Перамога сацыялізму» пры наяўнасьці ў ячэйцы 16 камуністаў, ні адзін з іх не працуе на скотным дварэ.

Можна сустрэць таксама і такія факты, калі камуністы, працуючыя на вытворчасьці, не паказваюць узорных прыкладаў работы, ня прымаюць удзелу ў сацыялістычным спаборніцтве.

Партыйныя ячэйкі павінны ўважліва падыйсьці да вывучэньня кожнага камуніста, выходзячы з чаго даць яму належную нагрузку і рэгулярна правяраць яе выкананьне, штодзенна аказваючы яму практычную дапамогу і апэрацыйнае кіраўніцтва. Усю выхаваўчую работу ячэек трэба падпарадкаваць задачы павышэньня кіруючай ролі камуніста на вытворчасьці і ў палітычным жыцьці саўгасу.

Мы не павінны забываць, што разгортваньне сацыялістычнай жывёлагадоўлі праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Ёсьць ня мала выпадкаў, калі клясава-варожы элемэнт, выкарыстоўваючы прытупленьне клясавай пільнасьці асобных кіраўнікоў савецкай гаспадаркі, пралазіць у саўгасы, на скотныя двары і робіць там сваю справу.

Сацыялістычныя формы і мэтады работы зьяўляюцца лепшым сродкам выкарыстаньня тых магчымасьцяй, якія забясьпечвае наша савецкая сыстэма гаспадаркі. Прывядзем прыклад з работы партыйнай ячэйкі саўгасу **«Завалочыцы».** Глускага раёну, па выкананьні пляну трэцяй бальшавіцкай вясны.

Яшчэ 10 мая саўгас «Завалочыцы» быў самым адсталым у раёне па тэмпах сяўбы. Выкананьне пляну стаяла пад пагрозай зрыву. Гэтае адставаньне было ліквідавана тады, калі партыйная ячэйка саўгасу правільна расставіла свае сілы, разгарнула сярод рабочых **масава-палітычную работу.** Кожную раніцу ў паасобных аддзяленьнях саўгасу праводзіліся кароткія парады-мітынгі, на якіх рабочыя прымалі ўдзел у вызначэньні вытворчых заданьняў. Апрача таго, кожны дзень у саўгасе праводзіліся вытворчыя парады брыгадзіраў.

15 мая ячэйка арганізавала дзень ударных брыгад. У гэты дзень брыгады амаль усіх вытворчых вучасткаў выехалі спаборнічаць на цэнтральны вучастак, на якім мела месца адставаньне. Гэтым была праведзена праверка выкананьня брыгадных дагавароў сацспаборніцтва і адначасова — грамадзкі буксір адстаючай брыгадзе цэнтральнага вучастку.

Усё гэта забясьпечыла саўгасу належныя вынікі ў правядзеньні веснавой сяўбы. Падобныя прыклады разгортваньня работы ёсьць і ў іншых саўгасах. Аднак, раённымі камітэтамі, а таксама раённым друкам і некаторымі цэнтральнымі газэтамі яшчэ зусім недыстарчальна аддаецца ўвагі пытаньням вывучэньня добрага вопыту, яго папуляризацыі і перанясеньня ў адстаючыя гаспадаркі.

У рэзультаце добра пастаўленай партыйна-масавай работы ячэек у перадавых саўгасах лепшыя ўдарнікі—рабочыя саўгасаў падаюць заявы аб уступленьні ў партыю. Так, у саўгасе «Завалочыцы» пасьля скончэньня сяўбы 10 рабочых падалі заявы аб уступленьні ў партыю і 15—ў камсамол.

Важнейшай умовай забясьпячэньня добрай работы партыйных ячэек зьяўляюцца правільныя ўзаемаадносіны паміж партгрупамі і партарганізатарамі з аднаго боку і бюро ячэйкі — з другога. Кожнае рашэньне ячэйкі павінна загадзя абгаварвацца ў партыйных групах з тым, каб пізавыя партыйныя зьвеньні і радавыя камуністы, улічыўшы тыя прапановы, якія ўзьнікаюць на тым ці іншым пытаньні сярод рабочых, маглі адлюстраваць іх у пастанове ячэйкі.

Партыйная група павінна, не адкладваючы ні на хвіліну, даводзіць да кожнага камуніста і рабочага дырэктывы партыі. Ажыцьцяўленьне гэтай задачы залежыць у першую чаргу ад таго, наколькі **канкрэтна і апэрацыйна будзе бюро ячэйкі кіраваць** парт-арганізатарамі ў пізавых зьвеньнях вытворчасьці. Трэба не дапускаць таго, каб парторгі пераводзіліся з аднэй брыгады ў другую. Цякучасьць парт-оргаў не дае магчымасьці ім вывучыць тых людзей, якіх яны абслугоўваюць і гэтым зьнижае іх працаздольнасьць. Трэба, каб партыйная група не станавілася на шлях перагружаных пытаньнямі сходаў, больш часта склікала кароткія апэрацыйныя сходы, ставіла-б па іх адно-два канкрэтных пытаньня, прыцягваючы да ўдзелу ў абгаварэньні іх беспартыйных рабочых свайго вытворчага вучастку. Задача партыйных ячэек — разгарнуць работу па стварэньні належных кіруючых кадраў для пізавога партыйнага зьвяна.

Разгортваньне крытыкі і самакрытыкі зьяўляецца магутным фактарам у справе забясьпячэньня баявой работы партыйных ячэек, разам з гэтым і саўгасаў.

Толькі пры ажыцьцяўленьні ўсіх гэтых умоў партыйныя ячэйкі жывёлагадоўчых саўгасаў будуць ажыцьцяўляць тую задачу, якая высунута ў прамове т. **Кагановіча** на XVI партзьезьдзе: — **«Усю сваю работу будаваць так, каб партыйная арганізацыя ўвесь час стаяла тварам да вытворчасьці, тварам да цэху, тварам да выкананьня тых баявых задач, якія перад намі пастаўлены ўсёй палітыкай генэральнай лініі нашай партыі».**

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

VI пленум ЦК ЛКСМБ

Разгортваньне выхаваўчай работы—важнейшая задача камсамолу

Пленум ЦК ЛКСМБ абморкаваў даклад тав. **Лубенскага** аб рабоце з актывам і летняй вучобе.

На працягу апошняга пэрыяду—з часу 9-га зьезду ЎсеЛКСМ,—мы мелі выступленьні правадыроў партыі тав. **Сталіна, Кагановіча і Постышава** па пытаньні марксыцка-ленінскага выхаваньня, па пытаньні вывучэньня гісторыі нашай партыі. Ўладаньне тэорыяй Маркса і Леніна набывае зараз у новай абстаноўцы работы асабліва вялікае значэньне. Без рэвалюцыйнай тэорыі, без вывучэньня тэй багатай спадчыны, якую пакінулі нам Маркс, Ленін і Энгельс, мы ня можам ажыцьцяўляць нашу практычную работу сацыялістычнага будаўніцтва.

Задача заключаецца ў тым, каб шырока разгарнуць марксыцка-ленінскае выхаваньне камсамольскіх мас, асабліва ва новага папаўненьня, павысіць якасьць усёй работы камсамолу, выхоўваючы яго ў духу бальшавізму, у духу разуменьня сусьветнага гістарычнага значэньня сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР.

Умовы работы камсамолу Беларусі спэцыфічныя. БССР знаходзіцца на стыку двух сьветаў—краіны сацыялістычнага будаўніцтва і капіталістычнага сьвету. Ад камсамольскай арганізацыі Беларусі патрабуецца асабліва вялікая ўвага, асабліва пільнасьць да аховы межаў, да справы ўзмацненьня абароназдольнасьці нашай краіны. Роля камсамолу ў гэтай справе, яго ўдзел у рабоце па ажыцьцяўленьні задач сацыялістычнага будаўніцтва ўсё павялічваецца. Ва ўсёй гэтай рабоце наша камсамольская арганізацыя мае багаты практычны вопыт. А вось, што датычыць тэарытычнага ўзроўню камсамолу, дык у гэтай справе ёсьць вялікае адставаньне. **Палітвучоба камсамольцаў і актыву знаходзіцца зусім у нездавальняючым стане.**

Аспоўнымі недахопамі палітвучобы ахоплівацца ніякі процант ахопу камсамольцаў вучобай, далёка нездавальняючыя якасныя паказальнікі гэтай вучобы, слабая падрыхтаванасьць пра пагандыстаў і адсутнасьць жывых форм у правядзеньні заняткаў. Рад мясцовых партыйных арганізацый недыстарчальна садзейнічаюць камсамольскім ячэйкам у разгортваньні марксыцка - ленінскага выхаваньня. Нават у такіх буйнейшых, вядучых арганізацыях камсамолу, як **Віцебская і Менская**, палітвучоба пастаўлена дрэнна. Тэарытычны ўзровень значнай часткі камсамольскага актыву не на належнай вышыні.

Такое становішча тлумачыцца тым, што ў радзе раённых арганізацый ЛКСМБ недаацэньваецца важнасьць палітвучобы. Настановы ЦК ЛКСМБ на гэтым пытаньні не знайшлі практычнага ажыцьцяўленьня на мясцох. Такое становішча пецярпіма. Задачы, якія стаяць перад камсамолам Беларусі, ня могуць быць выкананы без шырокага разгортваньня сыстэматычнай глыбокай палітвучобы, без разгортваньня марксыцка-ленінскага выхаваньня камсамольскага актыву і ўсёй працоўнай моладзі, як ў горадзе, так і ў вёсцы.

«Работа вобмацкам, работа ў пацёмках — такі лёс практычных работ нікаў, калі яны ня вывучаюць ленінізму, калі яны ня імкнуцца аўладаць ленінізмам, калі яны не жадаюць спалучаць сваю практычную работу з неабходнай тэарытычнай падрыхтоўкай, бо іменна тэорыя «дае практыкам сілу арыентоўкі, яснасьць пэрспэктывы, упэўненасьць у рабоце, веру ў перамогу нашай справы. Усё гэта мае і яна можа ня мець вялізарнага значэньня ў справе нашага сацыялістычнага будаўніцтва» (Сталін).

Уся работа па марксыцка-ленінскім выхаваньні павінна быць прасякнута **глыбокім вывучэньнем гісторыі нашай партыі**, бо «гісторыя бальшавізму,—як кажа тав. Постышаў,—зьяўляецца мацнейшай зброяй марксыцка-ленінскага выхаваньня камсамолу і загартаваньня яго радоў». Становішча, якое мы маем у галіне палітвучобы, патрабуе **карэнкага пералому, прыкаваньня да гэтай важнейшай справы ўвагі ўсіх камсамольскіх і партыйных арганізацый.**

Далей дакладчык спыняецца на канкрэтных мерапрыемствах, якія павінны быць вызначаны ў справе разгортваньня палітвучобы ў вытворчых, калгасных і саўгасных ячэйках. Шляхам шырокай растлумачальнай работы неабходна дабіцца поўнага ахопу камсамольцаў рознымі відамі палітвучобы і шырока выкарыстоўваць такія формы і мэтады вучобы, якія ў максымальнай меры спрыяюць павышэньню актыўнасьці ў занятках і зацікаўленасьці да іх.

Пастановы пленуму ЦК ЛКСМБ па пытаньні марксыцка-ленінскага выхаваньня — баявая праграма далейшых дзейсьняў. Гэтыя пастановы зьявяцца магутным фактарам мабілізацыі камсамольскіх мас на аўладань не марксыцка-ленінскай тэорыяй, на павышэньне ўдзелу камсамолу Беларусі ў практычным ажыцьцяўленьні чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Новая эканоміка краіны патрабуе новых добрых дарог

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі на БССР з агульнага ліку 60-70 тыс. кілёмэтраў дарог больш-менш добрых было каля тысячы кілёмэтраў. На працягу першай пяцігодкі БССР дабіваеся бязумоўных посьпехаў у барацьбе са спадчынай царызму. Пабудавана і адрамантавана некалькі тысяч кілёмэтраў. Але тэмпы дарожнага будаўніцтва да апошняга часу не адпавядалі патрабаваньням сучаснага разьвіцьця народнай гаспадаркі БССР.

Існуючая сетка дарог, яе канфігурацыя складаліся даўно, калі па бязрэйкавых шляхох праводзіліся мізэрныя перавозкі таварнай часткі сельскай гаспадаркі і прадметаў забесьпячэньня сельскага насельніцтва.

Зараз твар нашай краіны, эканоміка яе зусім зьмяніліся. Перамясьціліся адміністрацыйныя цэнтры. Вырасла шмат новых эканамічных пунктаў. А дарожная сетка засталася старая, зусім не адпавядаючая гэтым новым умовам, не адпавядаючая разьмяшчэньню прадпрыемстваў па апрацоўцы сельска-гаспадарчага сырцу (ільназаводаў, маслабоек, крухмальна-патачных заводаў, мясакамбінатаў і г. д.). Сетка дарог ня злучае МТС з вёскай, горадам, не дае шырокага выхаду на савецкі базар калгасам, МТФ, СТФ, не абслугоўвае новыя мэлірацыйныя масывы і г. д.

Старая сетка дарог прыводзіць да таго, што перавозкі праводзяцца ў большасьці абездамі, бо бліжэйшых простых дарог няма. У выніку — затраты лішняга часу, падаражэньне кошту перавозак і г. д.

Ня меншым недахопам, чым няправільная канфігурацыя, зьяўляецца дрэнная становішча дарог. Калісьці дробныя гаспадары вывозілі на базар свой нязначны тавар у некалькі прыёмаў і рабілі зусім нязначныя перавозкі прадуктаў з гораду. Гэтым перавозкам адпавядаў слабы конь і малы возік, якія і то ледзь праходзілі па дрэнай вузкай дарозе. Дарогі зусім рэдка будаваліся і амаль зусім не рамантаваліся. Калі памешчыку, або гандляру патрэбны былі вялікія перавозкі, дык ім больш выгадна было наймаць сялян па зусім нізкай цане, чым рамантаваць дарогі. Недарма дарогі былі прыводзэны царскім урадам да поўнага руйнаваньня.

Зараз, калі мы перайшлі да высока-таварнай сельскай гаспадаркі, калі асновай гаспадаркі зьяўляецца мацынізацыя і рацыналізацыя, калі ў шмат разоў павялічыліся перавозкі прамысловых тавараў у вёску і сельска-гаспадарчых прадуктаў у горад, мы ня можам заставацца пры старых дарогах. Яны не адпавядаюць двухконнай калгаснай і саўгаснай павозцы, ня кажучы ўжо аб аўтамашыне, трактары і г. д.

Па дрэннай дароге рух ідзе марудна, павозка натружаецца ня поўна, адбываюцца масавыя паломкі, калецтвы коняй і г. д. Усё гэта прыводзіць раней за ўсё да павялічэньня кошту перавозак. Так, па добрай дароге тона-кілёмэтр перавозкі каштуе 30-40 кап., а па дрэннай ён павялічваецца да 60-70 кап. Калі лічыць, што за другую пяцігодку мы павінны выканаць кали 5 млрд. тона-кілёмэтраў, дык у пераводзе кожнай тоны-кілёмэтру на 20 кап. мы атрымаем за пяць год каля 1 млрд. руб. страт ад дрэнных дарог. Гэта апрача значных страт, якія не падаюцца дакладраму ўліку.

Усе гэтыя факты плюс тое, што наша сельская гаспадарка з кожным месяцам усё больш пасьчваецца новымі машынамі, трактарамі і аўтамабілямі паказваюць усю актуальнасьць пытаньня дарожнага будаўніцтва.

Партыя і ўрад зьвярнулі вялікую ўвагу на дарожную справу. З года ў год павялічваюцца грашовыя асыгнаваньні і матар'яльныя рэсурсы. На дарогі раённага і сельскага значэньня адпускаецца бясплатна лес. Выдан рад пастаноў, накіраваных па разьвіцьцё дарожнага будаўніцтва. З мэтай паладжаньня лепшага кіраўніцтва гэтай справай на мясцох, апошняя пастанова СНК БССР прадугледжвае арганізацыю раённых дарожных аддзелаў па ўсіх раёнах.

Усе мерапрыемствы партыі і ўраду па разьвіцьці дарожнага будаўніцтва патрабуюць максымальнай увагі і дапамогі ўсёй партыйнай, савецкай, пралетарскай грамадзкасьці. Асабліва адказныя задачы пастаўлены ў бягучым годзе.

Поўнае выкананьне пляну 1932 г. зьяўляецца гарантыяй пасьпяховага выкананьня трацыёзных задач, якія пастаўлены ў галіне дарожнага будаўніцтва ў другой пяцігодцы.

Эканамісты: Г. і Ш.

За зрыў своячасовага выпуску газэт—да адказнасьці

(Ліст работніка райгазэты)

Віцебская друкарня «Камінтэрн» сыстэматычна зрывае своячасовы выпуск раённых газэт, якія там друкуюцца.

Вось факты абураючага падбайства з боку друкарні. Наша газэта «Ленінскі шлях», Сіроцінскага раёну, павінна была выйсьці 4 чэрвеня. **Выйшла толькі 8 чэрвеня.** Несвоячасовы выхад газэты адбіваецца на апэрацыйнасьці.

Па працягу 5 месяцаў газэта выходзіць **толькі па пяць нумароў у месяц замест плянавых 6. Друкарня кожны месяц зрывае выпуск ня менш аднаго нумару нашай газэты.**

Адсутнічаюць неабходныя для газэты шрыфты, ад чаго яна выходзіць ня ў тым выглядзе, які ёй прызначан рэдакцыяй.

На нашы неадпаразовыя скаргі адпойчы старэйшы майстар друкарні адказаў:

— Я нікога не баюся, а калі будзеце скардзіцца, дык будзе горш.

З боку дырэктара друкарні выпад самадура майстра **Аксэльрода** не атрымаў належнага рэагаваньня.

Віцебская РСІ павінна праверыць работу друкарні «Камінтэрн» і прыняць захады да стварэньня нармальных умоў выпуску раённых газэт.

Галаўнёў.

Самазабесьпячэньне—улюбёны занятак Ліса

(Ліст каапэрацыйнага работніка)

Калі я паступіў па работу ў аргмасавы сэктар праўленьня **ЗРК фабрыкі імя Крупскай**, я зўважыў наступнае зьявішча: хто знаходзіцца ў прыяцельскіх адносінах з старшынёю ЗРК **Лісам**, той прыходзіць да яго і атрымлівае такога тыпу паперку: «Выдаць такому столькі і столькі малака, яек».

Раздаючы тавары сваім прыяцелям, Ліс і сам сябе ня крыўдзіць. Нярэдкі выпадкі, калі ён прыходзіць у магазын і бярэ сабе тыя рэчы, якія яму патрэбны, бяз усякага ўліку. Нядаўна быў выпадак, калі Ліс дазволіў Рудэрман узяць з магазыну 30 мэтраў мануфактуры, якія ня былі выведзены ў расход.

Калі я рабіў аб гэтым заўвагі Лісу, ён мне адказаў, што «ў гэту справу табе няма чаго ўмешвацца, што табе трэба займацца толькі арганізацыйна-масавай работай».

Самаснабжэньне і заціск самакрытыкі—улюбёныя заняткі старшыні ЗРК Ліса. Трэба, каб належныя органы адвучылі яго ад гэтых заняткаў.

Хігеровіч.

ЗАВОД ІМЯ ВАРАШЫЛАВА ВЫПУСКАЕ СУШЫЛЬНЫ БАРАБАН ДЛЯ НОВАГА МАСКОЎСКАГА ЗАВОДУ ПА ВЫРАБЕ ХАЛОДНАГА АСФАЛЬТУ

Нам пішуць

Спэкулянт **Бунін Арон** нейкім чынам пралез па працу ў **Дрыбінскі райспажыўсаюз, Горацкага раёну.** Прыкрыўшыся маркай каапэрацыйнага работніка, **Бунін** працягвае сваю шкодную работу. Ён злоўлен у **абважаньні, абмерваньні** прапоўных, а таксама ў **разбазарваньні каапэрацыйных цьвікоў.**

На Буніна падана шмат скаргаў і заведзена судовая справа. Але ён пакуль яшчэ з работы ня зьнят.

«Лёгкая кавалерыя».

* * *

Афіцэр царскай арміі, а потым, у часе польскай акупацыі, меўшы сувязь з жандармэрыяй, **Семяняка Сьцяпан з вёскі Радкавічы, Любаньскага раёну,** працуе старшынёй рыбалоўнай арцелі і робіць там розныя злачынствы.

Семяняка разбазарыў рыбы на 2.000 руб. Узяў для сябе два камплекты спэцвопраткі і цукар, належачы рыбаком.

Любаньская раймілiцыя, куды даўно перадана справа на **Семяняку,** да гэтага часу яе не закончыла і тым самым дае магчымасьць шкодніку **працягваць свае злачынствы.**

Калгасьнік.

* * *

Камісія па мясазагатоўках пры **Брагінскім** сельсавеце пастанавіла за браць па мясазагатоўкі **апошнюю карову** ў калгасьніцы **Процька** (калгас «3-ці рашаючы»).

Брагінскі сельсавет замест дапамогі калгасьнікам у набыцьці каровы і іншай жывёлы робіць злачынствы, накіраваныя на зрыў важнейшай пастановы партыі аб тым, што кожны калгасьнік павінен мець карову і дробную жывёлу.

Брагінскія сьледчыя органы пілкіх захадаў да гэтых «левакоў» не прынялі.

Калгасьніца.

* * *

У Калгасцэнтры БССР адсутнічае ўлік пасланых тэлеграм.

З 1-га студзеня па 1 чэрвеня 1932 году па тэлеграмы выдаткавана **18 тыс. рублёў.**

Гэтыя выдаткі можна значна скараціць пры рацыянальным карыстаньні тэлеграфнай сувязьзю.

Вегман.

Ад рэдакцыі: **«Зьвязда» чакае неадкладнага рэагаваньня адпаведных органаў па гэтых пістох і хуткага паведамленьня аб выніках.**

Першаму выпуску спэцыялістаў Беларускага Дзяржаўнага Фінансава-Эканамічнага Інстытуту БССР

Ад Народнага Камісара Фінансаў БССР т. Хацкевіча

Вам, чырвоным спэцыялістам, будуючым ударнікам фінансавага фронту — шчырае бальшавіцкае прывітаньне.

Вялізарнейшае, пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва СССР, пасьпяховае сканчэньне пляну заключнага чацьвертага году першай пяцігодкі, ажыцьцяўленьне пастановы XVII партыйнай канфэрэнцыі ЎсеКП(б) аб пабудове бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ў другой пяцігодцы, стварае ўсё новую і новую складаную абстаноўку і патрабуе ад фінансава-крэдытнай сыстэмы напружанай, баявой, ударнай працы па ўзмацненьні тэмпаў і напырэньні крыніц сацыялістычнага накапленьня.

Уся праца фінансава-крэдытнай сыстэмы, арміі маладых і старых спэцыялістаў павінна быць сугуба правільнай і заўжды накіраванай да ажыцьцяўленьня фінансавых задач на аснове генэральнай лініі ленінскай партыі.

Адна з сучасных чарговых, важнейшых, палітычных і гаспадарчых задач — разгортваньне калгаснага гандлю і сацыялістычнага таваразвароту, масавая арганізацыя вытворчасьці тавараў шырокага спажываньня — павінна стаяць у цэнтры ўвагі ўсіх працаўнікоў фінансава - крэдытнай сыстэмы на даным этапе.

Вядучы непрымірымую барацьбу з правым ўхілам і «лявацкімі» заскокамі пераходу на сучасным этапе да простага прадуктаабмену, недаацэнкай ролі грошай і фінансава-крэдытнай сыстэмы, вы маладыя чырвоныя спэцыялісты і ўсе работнікі фінансава-крэдытнага апарату павінны паводле шасьці гістарычных указаў тав. Сталіна, упарта і жорстка праводзіць гаспадарчы разрахунак, дабіваючыся па ўсіх паказальніках поўнага выкананьня вытворчых пляноў.

Гістарычная задача пабудовы бясклясавага грамадзтва ў другой пяцігодцы патрабуе больш чым раней ад усіх фінансавых працаўнікоў вывучэньня пастаноў партыі і правільнага іх ажыцьцяўленьня, аўладаньня неабходнымі тэарытычнымі ведамі і тэхнікай фінансава - крэдытнай справы, правядзеньня фінансавых мерапрыемстваў на базе шырокай грамадзкай масавай працы.

Для кожнага фінансавага работніка зьяўляецца неабходнай умовай — разумець і правільна, па-бальшавіцку ажыцьцяўляць палітыку партыі і савецкай улады ва ўсёй фінансавай дзейнасьці. Кожнаму фінансаваму работніку неабходна заглядваць, залазіць ва ўсе поры народнай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва, зьвяшчаць недахопы, біць рублём адстаючых нядбайнікаў. Уся апэрацыйна-фінансавая работа павінна быць пастаўлена выразна з такім разьлікам, каб наша дзейнасьць забясьпечыла бесьперабойнае выкананьне фінансавага пляну як аднаго з важнейшых сродкаў выкананьня пляну чацьвертага, заключнага году.

Вы, выпускнікі, маладыя чырвоныя спэцыялісты, ажыцьцяўляючы на мясцох сваю важнейшую працу, павінны быць «арганізатарамі творчай ініцыятывы працоўных мас», павінны будаваць сваю працу сумесна з рабочымі і калгасьнікамі, пагнаяблюць з вялікімі посьпехамі набытыя вамі тэарытычныя і практычныя веды і перадаваць іх другім практычным фінансавым працаўніком, пераймаючы іх практычны вопыт для агульнай справы будаўніцтва сацыялізму.

За ўпартую працу па-бальшавіцку!

За новыя перамогі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва!

Няхай жыве пасьпяховае будаўніцтва сацыялізму і геніяльны кіраўнік гэтага будаўніцтва тав. **СТАЛІН!**

А. ХАЦКЕВІЧ.

„Трусагадоўчая арытмэтыка“ саўгасу „Дзягелева“

Гісторыя трусагадоўчага саўгасу «Дзягелева» пачынаецца наступнымі датамі.

У сакавіку 1930 году — афіцыяльнае заснаваньне саўгасу. У лістападзе 1931 году завезены першыя 526 трусоў з Украіны. На месцы набыта 81 штука. Усяго ў саўгасе 607 рознапародных трусоў.

На 1-га студзеня г. г. у саўгасе ўжо лічылася 506 трусоў. За месяц загінула 101 штука.

Гэта быў першы трывожны сыгнал з маладога саўгасу. Ці пачуў яго хто? Ці дапамог? Што зрабілі, каб трусы ня гінулі?

Белптушкатрусагадоўчы трэст, у сыстэме якога знаходзіцца саўгас, і вухам не павёў. Бешанковіцкія раённыя арганізацыі лічылі, што трусагадоўля ў саўгасе паогул ня іх справа.

Тым часам трусы гінулі. З першага студзеня да 19-га сакавіка колькасьць загінуўшых павялічылася яшчэ на 82 штукі. У пачатку масавага атрусу (сакавік) 50 проц. трусаматак і самцоў былі хворымі.

Колькі матак атрусілася, колькі нарадзілася трусянят — у саўгасе ня ведаюць. Ведаюць толькі адно — гадавалася маладняка 1.100 штук, а калі паступіў час адсадкі — засталося ўсяго 600. Адыход 45,4 проц. Між тым пават па самых скромных падліках ад атрусу 400 матак трэба было атрымаць ня менш 1.600 штук.

Прыплод мізэрны. А якасьць яго? У маі 95 проц. маладняка хварэла. Такава «трусагадоўчая арытмэтыка» гора-кіраўнікоў саўгасу «Дзягелева».

Дзе прычыны такіх правалаў?

З Менску, з трэсту ў саўгас прыяжджала шмат інспэктароў, якія многа гаварылі і многа паперы патрацілі па акты. Толку-ж ні на грош. Вось факты.

У саўгасе пачынаецца будаўніцтва. З Менску прыяжджае інспэктар трэсту **Грыгаровіч.** Па глыбокім сьнезе зімою 1931 году ён шукае месца для будаўніцтва трусатніка, шукае сыпучага... пяску. Грыгаровіч махае рукой і загадвае: «Вось тут будуйце». Месца здатнае: з поўначы — лес, з захаду— лес, а рэшта — глупства...

Пабудавалі 3 трусатнікі, павес і жылы дом. Калі-ж прыгрэла сонца, схамяпуліся, што ўсё гэта на балоце. У чэрвенскі сонцапёк вакол трусатніка лужыны вады і непраходная гразь.

Праз некаторы час з Менску прыяжджае аўтарытэтная камісія: інспэктар трэсту Галубчык і вэтдоктар Рудакоўскі. Будаўніцтва прызнана «амаль шкодніцкім». 15 тыс. рублёў дзяржаўных грошай затоплена ў балоце, тыя ня менш падтрымліваючы «лінію» і «гопар» трэсту, камісія ў акце адзначае: «Лічыць мэтазгодным закончыць будаўніцтва». Аб тым, што трусы на балоце жыць ня могуць, відома ня толькі камісіі, але кожнаму пісьменнаму. І ўсё-ж заключэньне камісіі пранапуе: «Закончыць будаўніцтва».

Дырэктар саўгасу т. **Цыбо** па ўсё дае адзін адказ: «Я малады спэц па трусагадоўлі, я слухаў трэстаўскіх спэцаў»—адгаворачкі ня вартыя камуніста. Але ёсьць яшчэ адна прычына, ад якой тав. Цыбо ўжо ніяк не адэпіцца. У трусатніках бруд і антысанітарыя. Падлога і клеткі забруджаны, гной ня ўбраны. У клетках валяюцца дохлыя трусяняты. Вось аспоўныя прычыны ганебных правалаў саўгасу «Дзягелева».

Справамі саўгасу павінны зацікавіцца органы ЦКК-РСІ.

М.

Стыба

Латвійская буржуазія шукае выхаду з эканамічнага крызісу

Эканамічны крызіс з незвычайнай сілай пануе ва ўсіх лімітрофных дзяржавах, у тым ліку і ў **Латвіі.** Калі параўнаць гаспадарчае становішча Латвіі ў сучасны момант са становішчам, прыкладна, год таму назад, дык становішча відавочным, што крызіс паглыбляецца з надзвычайнай шпаркасьцю. Аб гэтым сьведчаць наступныя афіцыяльныя лічбовыя даныя: у красавіку 1931 г. бягучыя рахункі складалі **51,1 млн. лат,** у красавіку 1932 г. — **31,5 млн. лат,** уклады ў буйныя банкі адпаведна — **64,5 млн. лат. і 36,2 млн. лат,** імпарт адпаведна **14,8 млн. лат і 6,7 млн. лат,** экспарт адпаведна **11,0 млн. лат, 8,5 млн. лат,** колькасьць банкрутстваў адпаведна — **11 тыс., 29** тыс., на суму ў 1931 г. **524 тыс.** лат і 1.851 тыс. лат у 1932 г.

Камэнтарыяў гэтыя лічбы не патрабуюць, яны гавораць самі за сябе.

Мы маем у Латвіі вялізарны рост беспрацоўя. Зімой 1931-32 г. мелася каля **40.000 беспрацоўных гарадзкога пралетарыяту;** у папярэднія гады колькасьць беспрацоўных у гарадох не перавышала 25-28.000 чалавек.

Гэта сьведчыць аб значным скарачэньні вытворчасьці гарадзкой промысловасьці, бо ў латвійскай прамысловасьці ўсяго занята каля **75.000** рабочых.

Наколькі востры характар мае ў сучасны момант эканамічны крызіс у Латвіі, аб гэтым сьведчыць таксама той факт, што дзяржаўны бюджэт 1931-32 г. канчаткова збанкрутаваў ўрад павінен быў заняцца складаньнем бюджэту панава. Але калі дзяржаўны бюджэт мінулага гаспадарчага году буржуазіі ўдалося сяк-так, хаця з дэфіцытам, выцягнуць, дык на бягучы 1932-33 гаспадарчы год бюджэт тыльці цяпер, у чэрвені, абгаварваецца ў сойме, хаця гаспадарчы год ужо скончыўся 1 красавіка.

Ня гледзячы на надзвычайную вострасьць гаспадарчага крызісу было-б недапушчальнай памылкай рабіць пасьпешныя вывады аб тым, што гаспадарка Латвіі нямінуча ідзе насустрач канчатковаму банкрутству і краху.

Латвійская буржуазія вядзе барацьбу за капіталістычны выхад з крызісу, за перакладаньне выпікаў крызісу на плечы працоўных гораду і вёскі. За апошні год мы маем зьніжэньне зарплаты ў прамысловага пралетарыяту на **20-50 проц.,** а ў сельска-гаспадарчых рабочых — **на 50-60 проц.** Трэба адзначыць, што наступленьне сельскай буржуазіі на жыцьцёвы ўзровень батракоў у гэтым годзе носіць настолькі арганізаваны характар, што **процістаяць гэтаму наступленьню могуць толькі моцным адзіным фронтам усе сельска-гаспадарчыя рабочыя пры актыўным падтрыманьні гарадзкога пралетарыяту.**

Адным са спосабаў перакладзьні выпікі крызісу на плечы працоўных, зьяўляецца навыплата зарплаты рабочым і батраком. Запазычанасьць рабочым прымае настолькі вялікія разьмеры, што ў сучасны момант **у Латвіі цяжка будзе знайсьці прадпрыемства, якое выплачвае больш або менш акуратна рабочым зарплату.** Каб ісьці насустрач прадпрыемцам, урад за апошні год выдаў законы, якія затрудняюць пры дапамозе суда прымусіць прадпрыемцу ўплаціць зарплату.

У зусім бязвыходным становішчы знаходзяцца беспрацоўныя. Пачынаючы з мая г. г. буржуазія і сацыялдэмакраты спынілі ўсякія клопаты аб беспрацоўных, пакідаючы іх у зусім бязвыходным становішчы. У апошні час беспрацоўныя выкідваюцца з кватэр, таму, што ня маюць магчымасьці ўплаціць кватэрную плату. Становішча беспрацоўных настолькі цяжкае, што нават буржуазная прэса ня можа замаўчаць такога факту, што цэлыя сем'і беспрацоўных жывуць пад плотам і паміраюць галоднай сьмярцю.

Самазабойствы сярод працоўных за апошні час растуць у вялізарных разьмерах, матві, пад пагрозай галоднай сьмерці, падкідваюць сваіх дзяцей на парогі дзяржаўных і муніцыпальных пасадавых асоб.

Асабліва цяжкае становішча працоўных паглядаецца ў Латвіі. **Латгалія ў літаральным сэнсе слова пануе ад галечы і голаду.** Нават буржуазная прэса павінна прызнаць, што становішча ў Латгаліі надаўляючае.

Ня гледзячы на жахрачае становішча працоўных, ня спыняецца рост дарагоўлі на тавары масавага спажываньня, у асаблівасьці на хлеб, цукар, мяса і масла.

Гарадзкая дробная буржуазія, прыдушаная падаткамі, знаходзіцца на краю канчатковага зруйнаваньня.

У студзені г. г. была зьніжана зарплата ўсім дзяржаўным і муніцыпальным служачым. Зарплата служачым выплачваецца надзвычай пеакуратна; працягваюцца масавыя звальненьні служачых.

Настаўнікам правінцыяльных народных школ, паводле афіцыяльнай заявы спэцыяльнай дэлегацыі, прыехаўшай на дзень у Рыгу скардзіцца, **ня выплачвалася пэнсіі на працягу апошніх шасьці месяцаў.**

У той час, калі галеча і беднасьць працоўных з кожным днём павялічваюцца — буржуазны ўрад пры актыўным удзеле с.-д. лідэраў траціць вялізарныя сродкі для дапляты прадпрыемцам і банкірам. Гэта, зразумела, ня можа зьніжыць крызіс, вывесьці буржуазію з цяжкага становішча, зьмякчыць унутраныя супярэчнасьці. Але гэта сьведчыць аб тым, што крызіс, па меры паслабленьня, будзе з усё большым цяжарам класьціся на плечы працоўных.

У сучасны момант непасрэдным правадніком палітыкі фінансавай буржуазіі Латвіі зьяўляецца так званы ўрад Скуенэка. Урад Скуенэка стварыўся ў сьнежні мінулага году ў рэзультаце апошніх соймавых выбараў. Урад Скуенэка мае тую асабліваасьць, што ён у аспоўным, абапіраючыся на дробнабуржуазныя колы гораду і кулацтва, цалкам знаходзіцца ў палоне фінансавай буржуазіі Латвіі. Урад Скуенэка — гэта дубінка ў руках фінансавай буржуазіі Латвіі, урад Скуенэка праводзіць палітыку фінансавай буржуазіі.

Аспоўныя задачы, якія латвійская фінансавая буржуазія ўскладае на ўрад Скуенэка, заключаецца ў тым, каб ён:

1. Забясьпечыў капіталістычны выхад з крызісу,

2. Падрыхтаваў, пад кіраўніцтвам і сумесна з міжнародным імпэрыялізмам, Латвію да інтэрвэнцыянісцкай вайны з СССР і

3. параліжаваў рэвалюцыйны рух шляхам устанаўленьня адкрытай фашысцкай дыктатуры.

Гэтыя пытаньні, зразумела, польга разглядаць адарвана, іх польга процінаставіць; яны паміж сабой перапляцаюцца, маюць узаемную сувязь.

У падрыхтоўцы інтэрвэнцыянісцкай вайны з СССР Латвія ў сучасны момант займае сур'ёзнае месца. У Латвіі свабодна арудуюць белабандыты і розная роду міжнародныя правакатары.

Урад Скуенэка ня толькі прыкрывае белабандытаў, ён і сам актыўна падрыхтоўвае інтэрвэнцыянісцкую вайну. Урад Скуенэка дэманстрацыйна адмаўляецца паставіць у сойме для ратыфікацыі савецка - латвійскі дагавор аб ненападзе, падпісаны абодвума бакамі ў студзені г. г. **Уся ўнутраная і замежная палітыка Скуенэка падначалена адной асноўнай мэце — падрыхтаваць інтэрвэнцыянісцкую вайну з СССР.**

Каб пасьпяхова падрыхтаваць інтэрвэнцыянісцкую вайну, урад Скуенэка па-зьверску распраўляецца з рэвалюцыйным рухам. Урад Скуенэка робіць усё магчымае, ужывае ўсе сілы і сродкі, каб змагацца з узрастаючым уплывам камуністычнай партыі.

У бліжэйшы час урад рыхтуецца ўвесьці новы судовы кодэкс, **які прад бачыць за прыналежнасьць да кампартыі да 15 год катаржных работ і дае права трымаць арыштаваных па палітычных прычынах у кайданох. Новы судовы кодэкс забараняе таксама забастоўкі, свабоду друку, сходаў і г. д.**

У Латвіі ў сіле ваенна-палявыя суды, пакінутыя, як спадчына «левым» сацыялістычным урадам (1927 г.), на чале якога стаяў той-жа Скуенэк.

Асабліва сурова буржуазія ў апошні час распраўляецца з рэвалюцыйным рухам. У жніўні мінулага году **былі закрыты ўсе рэвалюцыйныя рабочыя арганізацыі.** Урад Скуенэка прабуе ўсімі спосабамі перашкодзіць легальнаму рэвалюцыйнаму руху. Нядаўна ўрад разграміў рабоча-сялянскую фракцыю сойму.

У сакавіку г. г. урад Скуенэка арыштаваў першага дэпутата **Мэзіса,** абвінавачваючы яго ў тым, што ён нелегальна пераходзіў латвійскую граніцу. Гэта, зразумела, быў толькі проб ны крок для таго, каб панесьці рабоча-сялянскай фракцыі больш моцны ўдар і, у канчатковым выніку ліквідаваць яе зусім. У пачатку чэрвеня боль пасьцю галасоў сойм парашыў выдаць судовым уладам яшчэ 2 дэпутатаў.

Разгром рабоча-сялянскай фракцыі —пытаньне сугуба палітычнае, гэта пытаньне аб перагрупоўцы клясавых сіл у Латвіі, бо ўдар па рэвалюцыйным руху Латвіі — гэта наступленьне на працоўныя масы ў цэлым.

У сувязі з разгромам фракцыі стварыліся ўмовы, калі буржуазія будзе прабаваць больш моцна паступаць на матар'яльныя інтарэсы працоўных, больш інтэнсыўна падрыхтоўваць інтэрвэнцыю і яшчэ больш упарта змагацца за **ўстанаўленьне адкрытай фашысцкай дыктатуры.**

Разгром рабоча-сялянскай фракцыі— гэта крок да інтэрвэнцыі і фашызму.

Сацыял-фашысты зьяўляюцца аспоўнымі памочнікамі буржуазіі ў паступленьні на жыцьцёвы ўзровень працоўных, у падрыхтоўцы інтэрвэнцыі і ўстанаўленьні дыктатуры.

Сацыял-фашысты тэарытычна абгрунтоўваюць эканамічную палітыку Скуенэка; яны ідуць у авангардзе па дыскрэдытацыі СССР. Сацыял-фашысты шукаюць адкрытага супрацоўніцтва з урадам Скуенэка.

Для таго, каб палітычна падрыхтаваць разгром рабоча-сялянскай фракцыі, с-д. за апошні час ужываюць левыя трукі з агідным крывадушшам: яны прабуюць распаліць забастовачную барацьбу, каб потым яе здрадзіць або сумесна з паліцыяй разграміць; яны абяцаюць абараняць СССР, але патрабуюць, каб СССР самаліквідаваўся (літаральна), яны заклікаюць да барацьбы з фашызмам, але дапамагаюць граміць рэвалюцыйныя рабочыя арганізацыі і абараняць свабоду для белай эміграцыі і фашыстаў у цэлым.

Ня гледзячы на надзвычайны тэрор і рэпрэсіі, учыў камуністычнай партыі Латвіі шпарка расьце.

Аспоўныя задачы камуністычнай партыі Латвіі намечаны апошнім пацыраным пленумам, які адбыўся ў сакавіку г. г. Пленум указаў на аспоўныя задачы, якія выцякаюць з данага становішча Латвіі, яны заключаюцца ў тым, **каб мабілізаваць масы супроць наступленьня буржуазіі на матар'яльныя інтарэсы працоўных, мабілізаваць працоўных на барацьбу за рэвалюцыйны выхад з крызісу, каб узьняць масы на барацьбу супроць інтэрвэнцыі і фашызму.**

Ня гледзячы на тэрор і рэпрэсіі, ня гледзячы на здрадніцтва і левыя трукі с.-д. лідэраў, КПЛ з посьпехам спраўляецца з намечанымі пленумам задачамі і павядзе масы да барацьбы за рабоча-сялянскую ўладу.

ЗА МЯЖОЙ

КРЫЗІС НАНОСІЦЬ НОВЫЯ МАГУТНЫЯ УДАРЫ ПА КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ СЫСТЭМЕ

Эканамічная дэградацыя Англіі паглыбляецца

ЛЕНДАН. Канец першага паўгодзьдзя 1932 году паказвае, што эканамічная дэградацыя Англіі паглыбляецца. Здабыча вугалю з 2,4 млн. тон зьнізілася да 1,8 млн. тон у месяц. 30 проц. рабочых каменнавугальнай прамысловасьці беспрацоўныя. Выплаўка чыгуну зьнізілася **на 32 проц.** ніжэй узроўню ў маі мінулага году; выплаўка сталі—**на 18 проц.** Ангельская суднабудаўнічая прамысловасьць бязупынна згортваецца. У 1928 г. на пабудове знаходзілася паўтара мільёна тон новых караблёў, у бягучым годзе тамаж суднаў, якія будуюцца, **зьменшыўся ў 5 раз.** Параўнальна з 1928 годам замежны гандаль скарацілся амаль напалову.

Беспрацоўе ў Англіі ўсё больш павялічваецца. У 1928 годзе было 1.200.000 беспрацоўных, у маі 1932 г.—2.805.000. У сапраўднасьці-ж беспрацоўе ў Англіі павялічылася за гэты пэрыяд амаль **у тры разы.**

Абвастрэньне эканамічнага крызісу ў ПАЗШ

НЬЮ-ЕРК. Першае паўгодзьдзе 1932 г. заканчваецца абвастрэньнем эканамічнага крызісу ў ПАЗШ. Прамысловая прадукцыя зьнізілася на многа ніжэй узроўню 1921 г., моцна павялічылася беспрацоўе. Курсы аблігацый падаюць далей. Экспарт за апошнія 5 месяцаў складае **727 млн. даляраў** супроць **1.128 млн. даляраў у 1931 г.** Увоз—**636 млн.** даляраў у 1932 г. супроць **934 млн. даляраў** у 1932 г. Сотні тысяч фэрмэраў збанкрутавалі. Рэзка зьнізілася зарплата сельска-гаспадарчых рабочых. Аграрны крызіс вядзе да заняпаду тэхнікі ў сельскай гаспадарцы ПАЗШ. Многія фэрмэры карыстаюцца коньмі замест трактараў. Зарплата рабочых і служачых ва ўсіх асноўных відах прамысловасьці рэзка скарочана.

Колькасьць рабочых, якія баставалі, за першыя тры месяцы г.г. складае **94 тыс. чал.**

Крызіс яшчэ больш узмацніўся

РЫМ. У першым паўгодзьдзі бягучага году крызіс яшчэ больш узмацніўся. **Усе галіны італьянскай эканомікі даюць адкоўныя паказальнікі.** Выраб сталі зьнізіўся **на 17 проц.,** выраб чыгуну значна зьнізіўся. Замараньне гаспадарчага разьвіцьця краіны адчуваецца і на транспарце. Колькасьць перавезеных грузаў на чыгунках скарацілася на 13 проц. У студзені таксама безадзейных суднаў павялічылася больш, чым **у чатыры разы.** Нязначасьць гэтага сэзоннага скарачэньня будзе відавочнай, калі ўспомнім, што ў крызісным 1929 годзе лік беспрацоўных, які дасягнуў у лютым 489.347 чалавек, у чэрвені зьменшыўся да 193.325 чал., г. зн. больш, чым у 2 з паловаю разы. Вышэйпаданыя лічбы маюць на ўвазе толькі поўнасьцю беспрацоўных. Індэкс каштоўных папер зьнізіўся ў красавіку да 58.69 проц. супроць 72,33 проц. у студзені. Пры гэтым тэмпы паданьня нарастаюць бязупынна. За месяц так званага ажыўленьня з сакавіка па красавік індэкс каштоўных папер зьнізіўся **на 10,7 проц.**

Сельская гаспадарка Італіі ўступае ў пэрыяд выключных труднасьцяй. Хлебныя цэны з новым ураджаем упадуць ніжэй руйнавальнага ўзроўню мінулага году.

Першае паўгодзьдзе 1932 г. не дало паляпшэньня

ТОКІЁ. Першае паўгодзьдзе 1932 г. **закончылася паглыбленьнем эканамічнага крызісу** ў Японіі. Амаль напалову ўпаў курс іены. Экспарт скарацілся **на 34 млн.** Адначасова расьце імпарт **за кошт увозу матар'ялаў ваеннага характару.** Даходы японскіх шынак скарачаюцца. Збанкрутавалі кампаніі з капіталам у 28 млн. іен. Расьце беспрацоўе, пагаршаецца становішча рабочай клясы.

Аграрны крызіс у першым паўгодзьдзі 1932 г. прывёў да рэзкага зьнижэньня цэн на сельска-гаспадарчыя прадукты. Падаткі, што спаганяюцца з сялянства, складаюць чвэрць ураджаю 1932 г., арэндная плата—53 проц. ураджаю. Адбываецца катастрафічна шпаркае зьбядненьне шырокіх мас сялянства.

2 млн. поўнасьцю беспрацоўных ва Францыі

ПАРЫЖ. У красавіку 1932 г. агульны індэкс прамысловай прадукцыі складаў 95 супроць 124 індэксу 1931 году. Мэталюргічны індэкс у красавіку 1932 г. зьнізіўся на 36 проц. Выплаўка чыгуну скарацілася амаль **на 50 проц.** Такі-ж малюнак і ў іншых галінах прамысловасьці.

Пад канец першага кварталу 1932 году ва Францыі налічвалася **2 млн. поўнасьцю беспрацоўных і 6 млн. часткова беспрацоўных.** Замежна-гандлёвы зварот Францыі за першыя 5 месяцаў 1932 г. скарацілся **на 36 проц.** Імпарт за ўказаны пэрыяд скарацілся **на 10,38;** дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту за 6 месяцаў 1932 г.—**ад 4 да 5 млн. франкаў.** Збалянсаваньне бюджэту пойдзе **па лініі жорсткага скарачэньня выдаткаў на зарплату чыноўнікаў і служачых, пэнсіі, на сацыяльныя патрэбы.** Аграрны крызіс за мінулае паўгодзьдзе абвастрыўся. Шырокія працоўныя масы сялянства руйнуюцца, прадаючы хлеб за бесцань.

Прамысловасьць Германіі згортваецца

БЭРЛІН, 1. Зьніжэньне прамысловай прадукцыі Германіі працягваецца. Лік зарэгістраваных беспрацоўных амаль ня зьменшыўся, ня гледзячы на звычайнае сэзоннае ажыўленьне ў прамысловасьці. У маі германская прамысловасьць загружана **на 42 проц.** супроць **54 проц.** у маі мінулага году. Цяжкая прамысловасьць загружана **на 36,3 проц.** супроць **49,2 проц.** у маі мінулага году; лёгкая прамысловасьць—**49,4 проц.** супроць **60,3 проц.** у маі мінулага году.

Прымусовыя „адпачынкі" для дзяржслужачых ПАЗШ

ВАШЫНГТОН, 1. Прэзыдэнт Гувэр падпісаў закон, згодна якога большасьць дзяржаўных служачых, пэнсіі якіх складае больш 1 тыс. даляраў у год, абвешчаны ўвесь 30-дзённы «адпачынак» без захаваньня акладу. Гэтыя «адпачынкі» павінны з'эканоміць дзяржаве 100 млн. даляраў. Пэнсіі служачых, якія не падпадаюць пад дзейнасьць гэтага закону, будзе скарочана на 8-20 проц.

У БССР створан опэрны тэатр

Мы зьяўляемся сьведкамі выключнага яркага і бліскучага на сваёй сіле новага факту, які паказвае **непарыўны прагрэсыўны рост, шырокае разьвіцьцё ўсяе культуры і мастацтва ў Савецкай Беларусі.** Пастаноўка **«Кармэн»** нашай **Беларускай Дзяржаўнай студыяй Опэры і Балету** зьяўляецца яркім паказальнікам таго, што студыя фактычна перарасла ў опэрны тэатр. Опэра «Кармэн» на беларускай мове мае **гістарычнае значэньне** для далейшага росту і разьвіцьця ў БССР савецкага музычнага тэатральнага мастацтва, паказвае, якія **магутныя сілы ёсьць у рабочай клясы, якія таленты для ўсіх фронтоў гаспадарчага і культурнага сацыялістычнага будаўніцтва растуць з яе радоў.**

Ільля Гіттарц.

Калі ў акупаванай Заходняй Беларусі задушаны апошнія школы, калі ва ўсёй капіталістычнай Эўропе ідзе нястрымны ўнадак, выміраньне культуры і мастацтва, ідэйнае зьбядненьне да ўбоства і ўход ад суровай рэальнасьці ў містыку і папоўнічыму, — у Савецкай Беларусі, як і ва ўсім вялікім Саюзе, **бурна растуць пралетарскія па зьместу і нацыянальныя па форме культуры, шырока разьвіваюцца ўсе віды мастацтва.**

Першай пастаноўкай студыі, паказанай у мінулым годзе, была опэра **«Залаты пеўнік».** Ужо тады, у асноўным правільна разумеючы ленінскае вучэньне аб скарыстаньні культурнай спадчыны, студыя паказала нядэнныя шуканьні крытычнага ўспрыйманьня, крытычнага падыходу да клясычнага матар'ялу. У «Залатым пеўніку» ярка прарваліся на авансцэну тыя **дэмакратычныя тэндэнцыі,** што былі ў гэтым музычным творы, але якія старымі тэатрамі і буржуазнымі пастаноўшчыкамі стараннa выкрэсьліваліся, замазваліся. Разам з гэтым у сваёй першай рабоце студыя дапусьціла **сур'ёзныя памылкі, ідэйныя і мастацкія зрывы.** «Залаты пеўнік» у леташняй пастаноўцы меў усе аднакі буржуазнага **фармалізму і эстэтцва,** значныя ўплывы старых канонаў напудрана - арыстакратычных, урачыста-расфуфыраных і фальшывых «вялікіх» опэр.

Ад «Залатога пеўніка» зроблен вялікі і трудны перахад. Закончаны год вучобы і работы зьявіўся для студыі Опэры і Балету годам бліскучага росту і перамог. У «Кармэн», перамогны намылкі «Поўніка», студыя выходзіць ужо за звычайныя межы чыста вучэбных рамак. **Мы тут маем ужо новы малады Беларускі Опэрны Тэатр** з такім мастацкім і акторскім «касьцяком», пры якім ёсьць усе магчымасьці для шпаркага ідэйна-мастацкага і творчага росту.

Выбар опэры «Кармэн» для пастаноўкі на беларускай мове правільны і невыпадковы. «Кармэн», напісаная на матар'яле аднаіменнай аповесьці французскага пісьменьніка **Просьп'ера Мэрымэ,** зьявілася ў свой час **этапнай, новым рубяжом** у гісторыі ўсяе опэрнай творчасьці. Гэта, на сутнасьці, **першая опэра пра нізы,** якая ўступіла ў няроўную бойку супроць опэрных спэктакляў, разьлічаных на задаваленьне шырокіх арыстакратычных густаў. Кампазытар **Жорж Бізэ** (1838-1875 г. г.), напісаўшы музыку да «Кармэн», казаў: **«Школа рулад, фінціфлюшак і хлусьні памерла. Канчаткова памерла! Пахаваем яе бяз сьлёз, без шкадаваньняў і... наперад!»** Школа «рулад, фінціфлюшак і хлусьні»—гэта старая італьянская опэра, гэта яе пазьнейшая пасьлядоўніца—так званая «вялікая» опэра. Фінціфлюшкі і рулады паміралі, на зьмену ім нараджалася ў опэрным тэатры **новая плынь з дробна-буржуазнымі дэмакратычнымі тэндэнцыямі.** «Кармэн», пастаўленая першы раз у Парыжы ў 1875 г. і зьявілася яркім пераходам у разьвіцьці новага музыкальна-тэатральнага мастацтва.

Вялікі кампазытар **Чайкоўскі** даваў наступную ацэнку: «Кармэн»—«гэта ў поўным сэнсе шэдэўр, гэта значыць адна з тых нямногіх рэчаў, якім суджана адыграць у сябе ў надзвычай моцнай ступені музычныя імкненьні цэлай эпохі».

Некалькі раней да «Кармэн», якая рабіла рэзкі адыход ад цыпных, ілжывых гісторыка-гераічных опэр да звычайнага буднішняга, рэальнага жыцьця, былі дыямэтральна-процілеглыя адносіны. Зьяўленьне на арыстакратычнай сцэне гішпанскай цыганкі ў акружэньні фабрычных работніц і кантрабандыстаў выклікала актыўныя супраціўленьні французкай буржуазіі. Першыя спэктаклі «Кармэн» у парыскім тэатры «Камічнай опэры» спаткалі самыя рэзкія нападкі з боку арыстакратычнага асяродзьдзя, гэта опэра нават была зусім зьнята з рэпэртуару. Тое самае было з «Кармэн» на два гады пазьней і ў Пецярбурзе. Толькі выключныя вартасьці «опэры пра цыганку» як з музычнага, так і сцэнічнага боку стварылі Бізэ сусьветную славу, а «Кармэн» хутка пачала карыстацца нявымерна вялікім посьпехам, ставілася выключна на ўсіх сцэнах опэрных тэатраў.

Высокае дасканалае музычнае майстэрства, надзвычай удалае і моцнае злучэньне музыкі са словамі і дзеямі робяць опэру «Кармэн» цікавай і для нас.

Ставячы опэру Бізэ—«Кармэн», Беларускі Опэрны Тэатр у цэлым радзе вынадкаў ішоў па зусім правільным шляху набліжэньня спэктаклю да сучасьнасьці, так ярка намаляванай Просьп'ерам Мэрымэ ў сваёй аповесьці і зьніжанай, згладжанай аўтарамі лібрэта. У гэтым, як і ва ўсім гарманічным напаўненьні спэктаклю, адчуваецца ўмелая рука, таленавітая работа выраслага ў савецкім тэатры рэжысэра тав. **НОРДА.**

Акторскі калектыў студыі ў «Кармэн» бязумоўна **ўзьнімаецца на новую ідэйна-мастацкую вышыню,** выяўляе **значны рост,** рэзкі зрух наперад. Тут было-б вялікай недарэчнасьцю і бязглуздасьцю захвальваць сапраўды здольныя, таленавітыя адзінкі студыі, прыпісваць ім тое, чаго ў сапраўднасьці яшчэ няма. На жаль, на гэты шкодны шлях стала ў цэлым няправільная рэцэнзія **«Савецкай Беларусі»,** (Мік. Таўбэ. «С. Б.» 28 чэрвеня). Мы адзначаем таленавітых актораў **Александроўскую, Саліну і Балоціна,** якія, старанна і шчыра працуючы над вобразамі ў «Кармэн», дабіліся новага творчага росту, узьнялліся на вышэйшую якасную ступень як вакальнай тэхнікі, так і драматычнай ігры. Мы адзначаем надзвычай добрую ігру **Русіна** (Хозэ) і далейшы рост **Калінoўскага і Дзянісава** (Тарэадор). Выгадна вылучаюцца ў спэктаклі **Шаліра** (Фраскіта), **Касмальскі** (Цуніга), **Баначыч** (Мікаэла) і рад іншых таварышоў.

У рабоце над «Кармэн» выявіліся новыя здольныя сілы—**Мілашэўскі** (Данкайро), **Андруковіч** (Рамэндадо), **Кроз** (Мікаэла) і г. д. Узьнімаюцца значна вышэй ранейшых пастановак — **Пігулеўскі** (Эскамільё), **Пуроўскі** і **Швайко** (ксёндз), **Гульман** (Цуніга), **Васюковіч** (Мікаэла), **Чыслова** (Фраскіта), **Левіна Ф. І. Касьценіч** (Мэрсэдэс).

Відна праробленая вялікая работа кіраўніка балетнага зьдзелу **Крамароўскага.** У параўнаньні з «Поўнікам», у «Кармэн» балетныя сцэны робяць больш цэльнае ўражаньне, хоць усё-ж яшчэ застаюцца «вузкім» месцам спэктаклю. У балетнай трупе значна вырасьлі—**Калітоўская, Шчолкіна, Крамарэўская, камсамолка Пекур, Дрэйчын, Гурвіч.**

Масавыя харавыя сцэны на гэты раз гучаць сьмела і высока. Пры ўсёй недастатковасьці мужчынскіх галасоў, асабліва тэнароў, хормайстру тав. **Пятрову** ўсё-ж удалося і пры гэтых сілах стварыць добра сьпеты хор.

Аркестр в музычнага маладняка, пад кіраўніцтвам **Іньлі Гіттарца,** на аснове праведзенай вялікай работы, у спэктаклі ярка і кваліфікавана падае музыку Бізэ, усё яе багацьце мэлёдыі і гармоніі, усю дынамічнасьць і рухавасьць опэры.

Мы заслужана адзначаем усіх гэтых людзей таму, што **яны сваёй творчай работай і ідэйна-мастацкай вучобай дабіліся значнага якаснага росту, узьняліся на новую ступень музычна-тэатральнай тэхнікі.**

Але мы цяпер-жа папярэджваем, што **НЯМА НІЯКІХ** падстаў для **захвальваньня і самазаспакаеньня.** Узросты і ўсё больш і больш растучы культурны ўзровень шырокіх мас будаўнікоў сацыялізму ставіць надзвычай вялікія патрабаваньні да савецкага тэатральнага мастацтва, і гэтыя патрабаваньні павінны быць пакрыты.

Посьпехі «Кармэн»—гэта перамогі ўсяго калектыву Дзяржаўнай студыі Опэры і Балету. **Стварэньне ў БССР новага опэрнага тэатру зьяўляецца яркім фактам таго, што толькі пралетарыят, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, праз сацыялістычную рэвалюцыю на справе вырашыў нацыянальнае пытаньне, дае ўсе магчымасьці для шырокага разьвіцьця і росту нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьместу культуры.**

Высока-мастацкі опэрны спэктакль «Кармэн» зроблен рукамі рабочай клясы, яе людзьмі, пастаўленымі на гэтым вучастку культурнай рэвалюцыі. Камуніст **ІЛЬЛЯ ГІТТАРЦ,** дырэктар, мастацкі кіраўнік і дырыжэр, **арганізуе ўсю работу студыі, выходзячы з задач, пастаўленых партыяй перад фронтам савецкага мастацтва, дае ўзор правільнага правядзеньня партыйнай лініі на фронце мастацтва.**

Далейшая ўпартая барацьба за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі прывядзе нас да новых буйных перамог на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, у прыватнасьці, на фронце стварэньня поўнакроўнага вялікага мастацтва, вартага нашай сацыялістычнай эпохі.

Сцэна з опэры «Кармэн»

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

На Лёзанскай канфэрэнцыі

Германская прэса прызнае безрэзультатнасьць Лёзанскай канфэрэнцыі

БЭРЛІН, 1. Увесь сёньняшні германскі друк піша аб безрэзультатнасьці Лёзанскай канфэрэнцыі, праўда, у больш стрыманай форме, чым учора. Газэты выказваюць надзею, што канфэрэнцыя ня будзе закрыта, а будзе толькі адтэрмінована на некаторы час. У цэнтры ўвагі друку стаіць палеміка супроць агульнага англа-французкага пункту гледжаньня, згодна якога рэпарацыйная згода з Германіяй ставіцца ў залежнасьць ад згоды з ПАЗШ па пытаньні міжсаюзьніцкіх даўгоў.

Бліская да ўраду прэса заклікае германскую дэлегацыю ў Лёзанне ня пускацца ў доўгія перагаворы і ня йсьці ні на якія ўступкі.

Правал чарговай „сустрэчы"

ЖЭНЭВА, 1. 30 чэрвеня ў Жэнэве пасьля раду сустрэч і нарад адбылася ў межах дня чарговая «сустрэча» Гербэрта Самуэля, Поль Вэнкура, Жувэнэля і Гібсона. Як сьцьвярджае французкая прэса, **нарада скончылася бяз усякіх вынікаў,** бо Англія ня можа згадзіцца з планам Гувэра ў частцы морскіх узбраеньняў і таму імкнецца прымусіць Францыю абмяркоўваць у першую чаргу пытаньне аб скарачэньні асабовага складу сухаземных армій і толькі пасьля гэтага перайсьці да абмеркаваньня пытаньняў морскіх узбраеньняў.

Супроць падобнай працэдуры выказаліся французкія і нават амэрыканскія дэлегаты. Гэтымі працэдурнымі пытаньнямі і абмежавалася, як паведамляе газэта, учарайшая траістая нарада.

Новы праект выплаты рэпарацый

ПАРЫЖ, 30. «Інфармасьен» паведамляе з Лёзаны: «Спэцыяльны карэспандэнт агэнцтва Гавас мяркуе, што бюро алянсаванага прыйшло да наступных пастановаў: 1) Дзяржавы-крэдыторы павінны згадзіцца вызваліць Германію ад яе рэпарацыйных абавязацельстваў пры ўмове, калі Злучаныя Штаты са свайго боку анулююць свае прэтэнзіі; 2) Германія неадкладна выпусьціць гарантаваныя ўрадам абавязацельствы, якія будуць перададзены Базэльскаму «банку міжнародных разьлікаў» і пачнуць прыносіць даход з моманту адпаўзьненьня плацежаздольнасьці Германіі. Абавязацельствы будуць выпушчаны на намінальную суму ў 7 мільярдаў залатых марак. Германская дэлегацыя запрапанавала ў адказ запłаціць 2 мільярды рэйхсмарак, захоўваючы, аднак, за сабой права яшчэ раз абмеркаваць пытаньне са сваімі экспэртамі.

У процівагу да 1-га пункту германская дэлегацыя адмовілася далучыцца да ўсякае згоды, якая-б паставіла скасаваньне рэпарацыйных плацяжоў у залежнасьць ад ануляваньня Злучанымі Штатамі іх прэтэнзій ваенных даўгоў.

Французка-італьянскія пляны падзелу Абісініі

РЫМ, 30. Падзеі ў Абісініі набываюць вельмі сур'ёзны характар. У тэлеграму чэрвеня экс-імпэратар Ліг-Ясу, пасаджаны ў турму цэнтральнім імпэратарам Абісініі Хайле-Сілазі, уцёк з лагэрам падняць паўстаньне. Ваенныя экспэдыцыі, пасланыя, каб яго злавіць, вярнуліся без рэзультатаў, бо пачатак сэзону дажджоў робіць прасьледваньне нематчымым.

Паводле апошніх вестак Ліг-Ясу схаваўся ў раёне сваіх адзадумцаў і разам з імі падрыхтоўвае байцу супроць Хайле-Сілазі. Паводле вестак добра інфармаваных колаў уцяканьне Ліг-Ясу было падрыхтавана агентамі зацікаўленых вялікіх дзяржаў. Гэтыя падзеі набываюць асаблівае значэньне ў сьвятле кампаніі «абароны эўрапэйскіх інтарэсаў», якая вядзецца ў апошні час італьянскай прэсай. У апошнія дні газэты больш-менш падаюць пляны падзелу Абісініі.

Зазначэньні італьянскай газэты «Рэджыме фашыста» амаль літаральна супадаюць з заявамі, якія былі зроблены ў анонімным артыкуле, які прыпісваецца Бэртэлё і які зьявіўся ў «ТАН» у пачатку чэрвеня. У гэтым артыкуле «ТАН», абгаворваючы магчымасьць фрэнка-італьянскага зьбліжэньня шляхам прадастаўленьня Італіі калёніі, пісаў, што: «Італія ўладае ва Ўсходняй Афрыцы Эрэтрыяй і Самаліяй. Гэтыя дзьве калёніі разьдзяляе Абісінія. У плане агульнай франка-італьянскай згоды, а таксама са згоды Англіі можна прадаставіць Італіі прыгледзанае прэса экзамені пагра прасяканьня ў Абісініі».

Пляны брытанскага імпэрыялізму ў Тыбэце

Тыбэт — фэадальна - тэакратычная дзяржава, разьмешчаная ў паўднёвай частцы цэнтральнай Азіі, якую часта называюць «крышай мира». Гэтую «крышу мира» брытанскі імпэрыялізм ужо здаўна выбраў месцам для пашырэньня свайго ўплыву на ўсю Цэнтральную Азію. Прыпягаючы, з аднаго боку да паўночна-ўсходніх межаў Індыі, а з другога — з межамі паўночна-заходніх раёнаў Кітаю, Тыбэт па думцы ангельскіх імпэрыялістаў «павінен быў у свой час служыць прыкрыцьцём для Індыі з боку агрэсыўных замыслаў царскай Расіі, а таксама плацдармам для наступленьня на пасобныя паўночна-заходнія тэрыторыі Кітаю».

У даны момант Тыбэт па-ранэйшаму застаецца трамплінам для наскокаў брытанскага імпэрыялізму на Кітай, а так сама й выходным пунктам у выпадку наступальных дзеяньняў супроць Савецкага Туркестану праз Сіньцьзян (Заходні Кітай).

Для ажыцьцяўленьня сваіх плянаў у Цэнтральнай Азіі брытанскі імпэрыялізм ужо даўно дамагаецца стварэньня «вялікага Тыбэту». Яшчэ ў 1919 г. Англія прабавала далучыць да Тыбэту частку Манголіі, частку кітайскай правінцыі Ганьсу і іншыя блізкія раёны. Стварэньнем «вялікага Тыбэту» Англія заняла-б надзвычай выгоднае становішча для прасоўвэньня ў паўночна-заходніх раёны Кітаю, у прывэтнасьці ў правінцыі Сычуань і Ганьсу, і апрача гэтага, як мы сказалі, трымала-б магчымасьць простага ажыцьцяўленьня сваіх агрэсыўных плянаў у адносінах Савецкага Туркестану. Іменна гэтага дабіваецца брытанскі імпэрыялізм і іменна да гэтага накіравана ўся правакацыйная дзейнасьць ангельскіх рэзыдэнтаў у самым Тыбэце.

Ангельскі ўплыў у Тыбэце вельмі вялікі. Увесь таварэзварот Тыбэту знаходзіцца ў руках ангельцаў. У 1921 г. ангельцы дабіваюцца правядзеньня ў Тыбэт чыгункі, якая зьвязвала-б Індыю з Тыбэтам, арганізуюць аўтамабільныя экспэдыцыі, атрымліваюць канцэсію на эксплёатацыю натуральных багацьцяў, праводзяць тэлеграфныя лініі і г. д.

Шляхам выхаваньня тыбэцкай моладзі ў ангельскіх школах і падрыхтоўкі спэцыяльных кадраў і інструктароў для тыбэцкай арміі, Англія ўсяляк ума цоўвае свае пазыцыі ў Тыбэце. Трэба адзначыць, што ўплыў брытанскага імпэрыялізму асабліва значны сярод тыбэцкіх вайсковых лідэраў, якія навучаліся ў ангельскіх вайсковых школах.

Апіраючыся на кіраўнікоў тыбэцкай арміі і выкарыстоўваючы супярэчнасьці паміж Кітаем і Тыбэтам, а таксама ўсяляк скарыстоўваючы барацьбу за ўладу паміж Далай-ламай, неабмежаваным уладаром Тыбэту, і Панчэн-ламай — другім пасьля Далай-ламы галавой духавенства, Англія з посьпехам ажыць цяўляе свае захватніцкія пляны.

Пры дапамозе даволі ўплывовай ангельскай групы ў самым Тыбэце, Англія перш за ўсё імкнецца аддзяліць Тыбэт і ад астатняга Кітаю. Намінальна Тыбэт зьяўляецца васальнай дзяржавай Кітаю, хаця па сутнасьці кітайскі ўрад не карыстаецца там абсалютна ніякім уплывам.

Спрыяючы нібы імкненьням Тыбэту вызваліцца ад Кітаю, Англія гэтым шляхам умацоўвае тут уласныя пазыцыі. Калі ў 1911 г. тыбэтцы, выкарыстоўваючы рэвалюцыю ў Кітаі, узьнялі паўстаньне пад пёзунгам нацыянальнага вызваленьня ад Кітаю, Англія ўмела скрыстала гэтае паўстаньне ,у сваіх уласных інтарэсах. У 1912 годзе Тыбэт атрымаў аўтаномію і кітайскі ўрад паслаў туды карную экспэдыцыю. Уварваньне кітайскіх войск было пэрапынена ангельцамі.

АНГЕЛЬЦЫ, ЗАБЯСЬПЕЧВАЮЦЬ ТЫБЭТЦАЎ ЗБРОЯЙ І СКАРЫСТОЎВАЮЦЬ ТЫБЭТЦКІЯ ВОЙСКІ, У ЯКІХ ЕСЬЦЬ АНГЕЛЬСКІЯ ІНСТРУКТАРЫ І АНГЕЛЬСКІЯ АФІЦЭРЫ, ДЛЯ ЗАХВАТУ НОВЫХ ТЭРЫТОРЫЙ.

Далай-лама і ўся кіруючая кліка ў Тыбэце зьяўляецца зброяй у руках ангельцаў.

Пачынаючы з 1918 г. Англія ўзмацніла тут сваё наступленьне. Трэба пад крэсьліць, што дзеяньні брытанскага імпэрыялізму ствараюць пагрозу ня толькі для Кітаю, але і для СССР. Апошнія падзеі на тыбэцка-кітайскай мяжы праліваюць яшчэ раз яскравае сьвятло на пройскі брытанскага імпэрыялізму ў Цэнтральнай Азіі. Зусім відавочна, што ангельцам канчаткова ўдалося прыбраць Далай-ламу ў свае рукі. Як паведамляе кітайская газэта «Дагун-бао», Далай-лама ўвайшоў у сакрэтную згоду з ангельцамі, паводле якое ён прадаставіў ім канцэсіі на распрацоўку горных багацьцяў, права на разьвіцьцё пошты і сувязі і г. д. У абмен на гэта Англія прадаставіла тыбэтцам даволі вялікую колькасьць узбраеньняў у тым ліку і 40 палявых гармат. У тыбэцкай арміі, якая ўварвалася на тэрыторыю асобкай акругі Цінхаю і Чуньбяня, ёсьць ангельскія інструктары.

Маркуючы па вестках, што атрымліваюцца з Кітаю, бай паміж кітайскімі і тыбэцкімі войскамі разрастаюцца. Раёнам сваіх наступальных дзеяньняў тыбэтцы выбралі асобную акругу Цінхай і Чуньбень. Няма сумненьня, што тыбэцкія войскі пры простым падтрымань ні ангельцаў маюць намер у першую чаргу захапіць гэтыя раёны, якія будуць служыць базай для далейшага наступленьня на правінцыю Сычуань і Ганьсу, а таксама плацдармам для ўварваньня ў Сіньцьзян.

Цікава, што Далай-лама матывуе сваё выступленьне «неабходнасьцю прыдушыць камуністычны рух», які нібы моцна разрося ў апошнія гады ў прымежных раёнах. І тут для прыкрыцьця калёніяльнага грабяжніцтва і падрыхтоўкі брытанскім імпэрыялізмам глебы для наскокаў супроць СССР прыцягнуць за валасы стары аргумант, які да волі набіў аскоміну і нікога не пераконвае. У сапраўднасьці-ж ангельскі імпэрыялізм ужывае зараз дапейшы прок да рэалізацыі пляну стварэньня «вялікага Тыбэту». Пры гэтым важнейшым пунктам у практычным ажыцьцяўленьні пастаўленай задачы зьяўляецца пашырэньне брытанскага ўплыву ў заход нім Кітаі, межы якога датыкаюцца да межаў СССР.

САР.

5-га ліпеня, а 12 гадз. дня

ў Койданаве. Барысаве, Магілеве, Клімавічах, Воршы, Віцебску і Дрысе адкрываюцца

міжраённыя нарады рэдактароў лепшых насьценных газэт:

У **Койданаве**—раёны: Койданаўскі, Менскі, Заслаўскі і Вузьдзенскі.

У **Барысаве**—раёны: Барысаўскі, Смалявіцкі, Лагойскі, Крупскі, Бярэзінскі, Бягомльскі і Плешчаніцкі.

У **Магілеве**—раёны: Магілеўскі, Бялыніцкі, Клічаўскі, Чавускі і Шклоўскі.

У **Клімавічах**—раёны: Клімавіцкі, Касьцюковіцкі, Крычаўскі, Чэрыкаўскі і Мсьціслаўскі.

У **Воршы**—раёны: Аршанскі, Дубровенскі, Горацкі, Талачынскі, Сеньненскі, Чашніцкі і Лепельскі.

У **Віцебску**—раёны: Віцебскі, Лёзьнянскі, Сіроцінскі, Суражскі, Гарадоцкі, Бешанковіцкі.

У **Дрысе**—раёны: Дрысенскі, Полацкі, Вушацкі, Расонскі і Асьвейскі.

Кожным з паказаных раёнаў вылучаюцца дэлегаты ў складзе 3-х рэдактароў лепшых насьценных газэт і 1-га прадстаўніка раённай конкурснай камісіі.

Адказнасьць за сваячасовую яўку дэлегацый усклядаецца на рэдактароў раённых газэт.

АРГКАМІСІЯ.

Дзяржаўная плянавая камісія пры СНК БССР

СКЛІКАЕ

І-ю ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ НАРАДУ ПА ХЭМІЗАЦЫІ

народнай гаспадаркі БССР у 2-й пяцігодцы,

якая адкрываецца 5-VII-32 г. у 6 гадз. веч., у памяшканьні цэнтральнага дому тэхніці,

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:

1) Задачы хэмізацыі народнай гаспадаркі ў 2-й пяцігодцы.
2) Навуковыя прадпасылкі хэмізацыі краіны ў 2-й пяцігодцы.
3) Карысныя выкапні для хэмпрамысловасьці БССР у 2-й пяцігодцы.
4) Хэмічная прамысловасьць БССР у 2-й пяцігодцы.
5) Хэмізацыя сельскай гаспадаркі ў 2-й пяцігодцы.
6) Лясахэмічная прамысловасьць у 2-й пяцігодцы.
7) Хэмізацыя жывёлагадоўчай гаспадаркі ў 2-й пяцігодцы.
8) Хэмічныя кадры ў 2-й пяцігодцы.
9) Навукова-дасьледчая праца па хэмізацыі ў 2-й пяцігодцы.
10) Работа сэкцый: 1) сыравіны, 2) сельска-гаспадарчая і тукавая, 3) прамысловая, 4) лесахэмічная, 5) матэрыялы і навукова-дасьледчая, 6) камунальна-бытавая, 7) Харчэ-брадзільная і тлушчавая.

АРГБЮРО.

Інстытут завочнай тэхнічнай адукацыі „ВСНИТО"

КАМБІНАТЫ: РЫХТУЮЦЬ ІНЖЫНЭРАЎ, ТЭХНІКАЎ І ЧАРЦЁЖНІКАЎ БУДАЎНІЧАЙ І МЭХАНІЧНАЙ СПЭЦЫЯЛЬНАСЬЦЯЙ.

КУРСЫ: 1) Павышэньня кваліфікацыі інжынэрн. і тэхн. будаўн. механічн. спэцыяльнасьцяй. 2) Завочнай падрыхтоўкі ў ВТНУ і тэхнікум. 3) Грамадзка-палітычны дысцыплін для ПТР.

Прыём заяў круглы год. Праспэкты, анкеты, кантрольныя работы высылаюцца па запатрабаваньні па 20 кап. за экз. маркамі.

МОСКВА, ИЛЬИНКА, ПРОЕЗД им. ВЛАДИМИРОВА, 6.

ДЫРЭКЦЫЯ „ИЗТО".

СЁНЬНЯ, 3-га ліпеня, у 7 гадз. вечара, у садзе „Працасьветы" (Савецкая вул.) **адбудзецца пашыраная нарада старшынь і сакратароў ячэек МОПР'у.**

Запрашаецца ўвесь гарадзкі актыў.
Уваход па МОПР-білетах, якія разасланы па ячэйках.
Пасьля дакладу—мастацкая частка.
У выпадку дажджу нарада адбудзецца ў клюбе працасьветы.

„ЗЬВЯЗДА", радыёгазэта **„За бальшавіцкія тэмпы"** і цэнтральны штаб па правядзеньні месячніка дарожнага будаўніцтва арганізуюць 5-га ліпеня, у 6 гадзін вечара

РАДЫЁПЕРАКЛІЧКУ РАЙШТАБАЎ

па пытаньні **ходу месячніка дарбудаўніцтва**

Парадак перакліччы наступны:

Уступнае слова ад цэнтральнага штабу—тав. **ФРУМКІНА.**

Інфармацыі: Менскага гарадзкога штабу, Барысаўскага, Гомельскага, Магілеўскага, Віцебскага, Полацкага, Слуцкага, Рэчыцкага, Мазырскага і Пухавіцкага райштабаў

„Зьвязда"
„За бальшавіцкія тэмпы"
цэнтральны штаб па правядзеньні месячніка дарбудаўніцтва.

Летні тэатр саду „ПРАФІНТЭРН" | Сёньня і штодзённа **3-ці цыкль** эстрадна-цырковых паказаў

МЮЗІК-ХОЛ у 2-х адзд.

Пачатак у 9 гадз. Білеты ў рабкасе з 12-2 і з 4-6 гадз. веч. ў касе тэатру з 6 з пол. гад.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Новы замежны фільм **ЛУЛУ** трагедыя ў 7 част. Звыш прагр. кіно-хроніка Саюзкіно

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Мастацк